Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 14 1933 г. АЎТОРАК № 251 (4795)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Завяршыць ссыпку насенных фондаў і прыступіць да размеркавання даходаў. С. Я. ВАЛЬФСОН—Нацыяналістычны культ загніваючага капіталізма.

УСЕБЕЛАРУСКІ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ ТАВ. ГІКАЛО. Ператварыць кожны соцдагавор у сапраўдную баявую праграму барацьбы за план.

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР Аб ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМОВАГА РАМОНТА ТРАКТАРАЎ І БУДАЎНІЦТВА МТМ ПА СІСТЭМЕ НАРКАМЗЕМА.

Пабудован буйнейшы ў свеце самалёт.

СОВЕЦКА-АМЕРЫКАНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ.

«Выбары» ў Германіі—Мільёны галасоў абвешчаны «несапраўднымі».

ЗАВЯРШЫЦЬ ССЫПКУ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ І ПРЫСТУПІЦЬ ДА РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ

Рыгор Лазаковіч, былы жабрак, зараз ударнік калгаса імя 518 (Бабруйшчына). Цесна звязаў Рыгор своё жыццё з калгасным падыёмам.

Многа важыць сёлета працадзень у Рыгоравым калгасе — 4 кілаграмы збожжа і 24 кілаграмы бульбы. Калгас поўнасцю разлічыўся з дзяржавай.

Сумленная Рыгорава праца ў калгасе забяспечыла яму і яго сям'і сыты год. Адной бульбы на свае працадні Рыгор атрымаў 100 цэнтнераў. У хаце Рыгора вы ўбачыце новую шафу, новыя крэслы і швейную машыну.

Жыццё Рыгора Лазаковіча — гэта жыццё соцень тысяч ударнікаў новай калгаснай вёскі. Не засталося і следа ў ім ад ранейшай галечы, цэмры і бескультур'я. Бязвыротна канула ў мінулае знясільваючая праца на сваёй вузкай дзесяціне і кулацкая кабала. Іх замяніла калектыўная прадукцыйная праца на неабсяжных калгасных палетках.

У жыцці Рыгораў Лазаковічаў як у люстэрку адбіваецца правільнасць палітыкі партыі на вёсцы. Сёлетні сельска-гаспадарчы год з'яўляецца буйнейшай вехай на шляху сацыялістычнай перабудовы вёскі. Пад кіраўніцтвам партыі на чале з тав. СТАЛІНЫМ мільёнамі калгаснікаў, выступіўшых на барацьбу за большэвіцкія калгасы, за заможнае жыццё, завяваны высокі ўраджай.

Лепшым паказальнікам таго, як пройдзен сёлетні год, з'яўляецца выкананне дзяржаўных заданняў. Да XVI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР выканала пастаўкі важнейшых відаў сельгаспрадукту. Дзяржаўны план збожжапаставак выканан датэрмінова да 20 кастрычніка, план пастаўкі бульбы выканан да 28 кастрычніка, адгрузка бульбы і гародніны Ленінграду—да 25 кастрычніка.

Гэта перамога з'яўляецца лепшым доказам таго, што «адбыўся прыкметны пералом у калгасным руху, адносіны да калгаснай працы ў значнай масе калгаснікаў змяніліся, дысцыпліна прыкметна ўмацавалася, пагардлівыя адносіны да працадня ў калгасах змяніліся імкненнем небольш выпрацаваць гэтых працадзён, барацьба за захаванне грамадскай калгаснай уласнасці, супроць расхрабалькаў, супроць подыраў і гультаёў значна ўзмацнілася, арганізаванасць калгасных мас узнялася» (МОЛАТАЎ).

Палітаддзелы МТС, створаныя па ініцыятыве т. СТАЛІНА, з'явіліся магутнай зброяй партыі ў барацьбе за большэвіцкія калгасы. У калгасах і МТС ад чуваюцца ўздзеянне цвёрдай большэвіцкай волі, новай авангардай партыйнай сілы, якая прышла ў вёску.

Аднак, «не зважаючыся дасягнутымі поспехамі, мы з яшчэ большай напружанасцю сваіх сіл, з яшчэ большай большэвіцкай воляй і энергіяй возьмемся за знішчэнне сур'ёзных недахопаў, якія ёсць у практычнай нашай рабоце» (ПОСТЫШАЎ).

Гэтае ўказанне тав. Постышава калгаснікам Украіны цалкам датычыць і калгаснікаў БССР.

У будучым годзе мы павінны ва што-б там ні стала дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю і большага калгаснага даходу. Гэта будзе [illegible] ад своечасовай і добрай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Ссыпка насенных і страхавых фондаў, высокая якасць насення і добрае яго захаванне да пачатку сяўбы—адна з важнейшых умоў у барацьбе за тое, каб у будучым годзе ўзяць яшчэ больш высокі ўраджай.

Спракатаясь ва ўраджайнасці, якая назіраецца ў нас сёлета, ва многім залежыць ад таго, што ў шмат якіх мясцах насенне збіралася ў нас вясной перад самым пачаткам сяўбы, прычым у насенныя фонды трапляла часта не ачышчанае і не адсартаванае насенне.

Праверка, праведзеная Наркамземам у РЭЧЫЦКІМ, АСІПАВІЦКІМ І КРЫЧАЎСКІМ раёнах, паказала, што большасць калгасаў гэтых раёнаў, выканаўшых свае абавязацельствы перад дзяржавай, па ўсіх сектарах згодна ўручаных абавязацельстваў, забяспечыўшы поўнасцю ссыпку і ачыстку насення, праведзем размеркаванне калгасных даходаў па колькасці і якасці працы кожнага калгасніка.

Гэтым самым мы зробім далейшы крок наперад да яшчэ больш высокага ўраджаю ў будучым годзе, да ператварэння ўсіх калгасаў у большэвіцкія, свае абавязацельствы перад дзяржавай, да заможнага калгаснага жыцця.

Дагэтуль не прыступіла да ссыпкі насенных фондаў. Гэта не выпадковасць. Гэта вынік апартуністычнай бяздзейнасці мясцовых арганізацый, райзямадзэлаў і МТС у першую чаргу. Гэта неразуменне таго, што класавы вораг зараз будзе напружваць усе свае сілы, каб разбазарыць, папсаваць насенныя фонды, каб сарваць барацьбу добрасумленных калгаснікаў за яшчэ больш высокі ўраджай у будучым годзе.

Праверыць, ці сапраўды ссыпаны насенныя і страхавыя фонды ў размерах неабходных для засева яравога кліна будучага года, праверыць якасць, ачыстку, сартыроўку і захаванне насення, рашуча перасякаючы спробы разбазарыць насенне і спекуляцыю збожжам — баявая неадкладная задача партыйных і совецкіх арганізацый на вёсцы.

Ссыпка насенных і страхавых фондаў для БССР, якая набліжаецца да вылкання сваіх абавязкаў перад дзяржавай па ўсіх сектарах, мае асаблівае значэнне.

Апублікаваная дырэктыва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР мясцовым, партыйным і совецкім органам падкрэслівае, што «абвяшчэнне калгаснага гандля збожжам у гэтых краях і абласцях затрымліваецца толькі тым, што ў іх не закончана яшчэ ссыпка насенных і страхавых фондаў».

ЦК і СНК папярэджваюць, што калгасны гандаль хлебам не можа быць дазволен да поўнага стварэння насенных і страхавых фондаў у калгасах. Гэту дырэктыву павінны цвёрда памятаць усе партыйныя і совецкія арганізацыі на вёсцы і шырока папулярызаваць яе сярод калгаснай масы.

Са ссыпкай насенных і страхавых фондаў і калгасным гандлем цесна звязана і другая, не менш важная палітычная кампанія, ад правільнага праведзення якой залежыць гаспадарча-палітычнае ўмацаванне калгасаў і работа будучага года. Мы маем на ўвазе размеркаванне калгасных даходаў.

Матэрыялы, якія мы сёння друкуем, паказваюць, што правільнае размеркаванне даходаў па прынцыпу хто больш і лепш працуе, той больш і спрымлівае, з'яўляецца моцным штуршком для поўнага знішчэння подырыцтва ў калгасах і максімальнага ўмацавання працоўнай дысцыпліны.

Асновай правільнага размеркавання калгасных даходаў з'яўляюцца дасканалы, правільны калгасны ўлік. Адной з прычын, зменшаючых лагу працадня, з'яўляецца рост непрадукцыйных выдаткаў у калгасах, налічэнне працадзён таму, хто іх не зарабіў.

Папярэдняя праверка паказала, што ў налічэнні працадзён у радзе калгасаў дапушчаны грубейшыя скажэнні, якія прыводзяць да зніжэння вагі працадня, зменшэння даходаў добрасумленных калгаснікаў-ударнікаў.

Гэта ёсць новы манеўр кулака, які шляхам разбазарвання працадзён, здабытых добрасумленнымі калгаснікамі, імкнецца перашкодзіць далейшаму руху наперад—да заможнага калгаснага жыцця.

Справа размеркавання калгасных даходаў з'яўляецца справай усіх партыйных і совецкіх арганізацый. Задача заключаецца ў тым, каб не даць подыру магчымасці пажыўцца за кошт добрасумленнага калгасніка. Уся калгасная маса на чале з рэвізійнымі камісіямі павінна быць уцягнута ў шырокую праверку работы кожнай калгаснай брыгады, кожнага калгасніка на працягу с.-г. года і налічаных у калгасе працадзён.

Толькі поўным выкананнем сваіх абавязкаў перад дзяржавай па ўсіх сектарах згодна ўручаных абавязацельстваў, забяспечыўшы поўнасцю ссыпку і ачыстку насення, праведзем размеркаванне калгасных даходаў па колькасці і якасці працы кожнага калгасніка.

Гэтым самым мы зробім далейшы крок наперад да яшчэ больш высокага ўраджаю ў будучым годзе, да ператварэння ўсіх калгасаў у большэвіцкія, свае абавязацельствы перад дзяржавай, да заможнага калгаснага жыцця.

ВЫСТУПЛЕННЕ К. Е. ВАРАШЫЛАВА НА АДЭСКІМ З'ЕЗДЗЕ КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

АДЭСА, 13 лістапада.

Адкрыўся другі з'езд калгаснікаў-ударнікаў Адэсчыны. У рабоце з'езда прынялі ўдзел т. т. ВАРАШЫЛАЎ, ПОСТЫШАЎ, БУБНОЎ, БУДЗЁННЫ, КАГАН, КРЖЫЖАНОЎСКІ, сакратар абкома ВЕГЕР, старшыня аблвыканкома ГОЛУБ, старшыня ЦКК КП(б)У СУХАМЛІН, камандуючы УВА ЯКІР і інш.

З'яўленне т. т. Варашылава і Постышава з'езд суспракае бурнымі авацыямі. Тав. Варашылаў выступіў з прамовай, у якой вітаў з'езд ад імя ЦК партыі і ўрада.

Параўнаўшы работу добрых і дрэнных калгасаў, успомніўшы аб наглядзанных у час сваёй веснавой паездкі па калгасах Адэсчыны, тав. Варашылаў лічыць галоўнай тэмай тое, што да гэтага часу 6-7 проц. збожжа ляжаць на палях Адэскай вобласці няўбраным.

Ён лічыць гэта рэзультатам расхлябанасці паасобных раёнаў, паасобных калгасаў і прыводзіць у прыклад найлепшую арганізацыю, узорную дысцыпліну і парадак у Чырвонай арміі.

Гаворачы аб міжнародным становішчы СССР, тав. Варашылаў заявіў:

— Мы павінны забяспечыць найлепшую работу на ўсіх участках нашай гаспадаркі, мы павінны быць гатовы даць сакрушальны адпор усякім замахам гораў парушыць нашу мірную працу. Чым мы будзем багацей, эканамічна мацней, тым небяспечней будзе ўсякаму ворагу на нас напасці.

Бурнай авацыяй, крыкамі «ура» праводзяць делегаты тав. Варашылава.

У заключэнне тав. Варашылаў жадае калгаснікам Адэсчыны новых, больш буйных поспехаў у перабудове сваёй сельскай гаспадаркі, у ператварэнні ўсіх калгаснікаў у заможных.

(БЕЛТА).

ХТО БОЛЬШ І ЛЕПШ ПРАЦАВАЎ, ТОЙ ПАВІНЕН БОЛЬШ І АТРЫМАЦЬ

Калгаснікі становяцца заможнымі

Паміж чыгуначнай станцыяй Лёзна і возерам Буй раскінуліся калі поравадзога калгаса Лёзненскага раёна «АПОРА СОВЕТАЎ». Калгас датэрмінова здаў дзяржаве па абавязковых пастаўках 144 цэнтн. бульбы, 86,4 цэнтн. збожжавых. Да 20 кастрычніка выканан кантрактацыйны дагавор па здачы ільнатрасты. Траста здана высокаякасная. Зроблен поўнасцю раз лік з МТС па натураплаце. Калгас засыпаў высокаякасным насеннем насенны і страхавы фонды. Створан фуражны фонд у 117 цэнтн. аўса, з разліку на 2 кіло кожнаму калю.

Ураджай сёлета быў у калгасе высокі. Пры дапамозе палітаддзела МТС была добра апрацавана зямля, добра праведзен абмалот ураджаю. З кожнага га калгас атрымаў ураджай: жыта — 10,68 цэнтн., пшаніцы — 10,71 цэнтн., ячменю — 9,8 цэнтн. і бульбы 85 цэнтн.

23 кастрычніка калгаснікі падвялі вынікі сваёй работы за год і прыступілі да размеркавання ўраджаю. Праўленне калгаса пры дапамозе палітаддзела лёзнянскай МТС закончыла афармленне разліка і складанне канчатковых спісаў размеркавання ўраджаю па працадзнях. Гэтыя спісы былі абмеркаваны агульным сходам калгаснікаў. На сход прышлі ўсе калгаснікі. Выступаючыя ў спрэчках называлі прозвішчы ўдарнікаў, прагульшчыкаў, гультаёў, уносілі прапановы, каму трэба павысіць ацэнку працадня, каму знізіць.

У калгасе працавала дзве брыгады. Пры ацэнцы іх работы высветлілася недапушчальнае парушэнне прынцыпаў брыгаднай работы. Многія працэсы работы былі абзялічаны. Намалочанае збожжа і выкананую бульбу ў калгасе запрыходавалі не па кожную брыгаду ў паасобку, а разам. Гэта не дало магчымасці падлічыць вынікі соцэкаборніцтва паміж брыгадамі.

Пры індывідуальнай ацэнцы работы кожнага калгасніка, брыгадзіру Лукісаву за тое, што ён мала аддаваў увагі расстаноўцы сіл брыгады і сам не працаваў у ёй, не вызначаў заданя нарады на работу і вёў дрэнны ўлік, сход пастанавіў замест налічаных 1,1 працадня за кожны дзень яго работы, знізіць яго, апрача працадня. Прагульшчыку Гукаву Якву знізілі ацэнку працадня на 10 проц.

Новікаву Пятру за тое, што ў яго бытнасць вартаўніком калгаснага свірна пакралі 10 пудоў збожжа, апрача матэрыяльнага спагнання і да дачы пад суд, яшчэ знізілі ацэнку працадня на 10 проц. Конюху Прусаву Ігнату за дрэнны догляд за коньмі знізілі ацэнку працадня на 10 проц.

Ударнікам ацэнку працадня павялічылі. 70-гадоваму ўдарніку якасці Струнаву Янку, выпрацаваўшаму на палявых работах на 20 кастрычніка 227 працадзён, павялічылі ацэнку працадня на 10 проц. Ударнікам Варапаеву Ягору і Лакісавай Ганне павялічылі ацэнку працадня на 5 проц.

У параўнанні з мінулым годам вага працадня ў калгасе вырасла. Летась на адзін працадзень прыпадала збожжавых 2,6 кіло, бульбы 3,6 кіло, а сёлета збожжавых 3,35 кіло, бульбы 5,47 кіло.

Ужо сёлета добрасумленныя калгаснікі становяцца заможнымі. Сям'я Каралёва Ягора да ўступлення ў калгас была серадняцкай, цяпер мае 9 чалавек, з іх працаздольных 4. На працадні атрымлівае 3.725 кіло збожжавых і 6.083 кіло бульбы. Удава Варапаева Марыя, маючы сям'ю з 8 чалавек, з іх працаздольных толькі 2, атрымала збожжавых 2.144 кіло і бульбы 3.500 кіло.

Размеркаванне ўраджаю ў калгасе «Апора советаў» ушчэнт разбіла кулацкую хлусню аб тым, што многасямейныя калгаснікі не выпрацуюць у калгасе на год сабе хлеба.

Зроблен першы крок да заможнага жыцця. Задача калгаса — у будучым годзе дабіцца яшчэ больш высокага ўраджаю.

МІНЧУКОЎ, КАПЫРЫН.

ГУСЬ КАШТУЕ 300 РУБ.

Калгасны ўлік з'яўляецца адным з участкаў класавай барацьбы. Заможнасць кожнага калгасніка залежыць ад таго, наколькі правільна пастаўлен у калгасе ўлік, ці не налічаны працадні таму, хто іх не зарабіў, ці няма ў калгасе непрадукцыйных, немэтазгодных выдаткаў, якія змяншаюць вагу працадня.

Адной з прычын, уплываючых на змяншэнне вагі працадня, з'яўляецца рост адміністрацыйных выдаткаў у калгасах. Спецыяльнай пастановай урада ўстаноўлена, што колькасць працадзён, якія выдаткоўваюцца на кіраўнічы і абслугоўваючы апарат, не павінна перавышаць (у залежнасці ад памераў і спецыфічнасці гаспадаркі) 8-мі процантаў ад агульнай колькасці выпрацаваных працадзён.

Яна ж выконваецца гэтая пастанова ўрада ў нашых калгасах?

Гэтым пытаннем па ініцыятыве палітаддзела рагачоўскай МТС занялася рагачоўская РКК-РСІ, якая разам з комсамольскай арганізацыяй раёна правяла масавы рэйд-праверку адміністрацыйных выдаткаў у калгасах. Рэйд выявіў такія абураючыя факты, што яго ўрокі павінны быць улічаны ўсімі раёнамі БССР.

Калгас «ЧЫРВОНЫ ЛУЧ», Лучынскага сельсавета. На ўсе віды работ з 1-га студзеня па 1-е верасня калгасам выдаткавана 6.549 працадзён, у тым ліку: на палявыя работы 3.209 працадзён, на дробныя работы і дзяржаўныя абавязацельствы — 900 працадзён, а на абслугоўваючы і адміністрацыйны персанал 2.440 працадзён.

Што ўваходзіць у лік гэтых 2.440 працадзён?

На варту выдаткавана 493 працадні, на конюха — 375, на кладаўшчыка — 200, на брыгадзіра — 213, на старшыню — 376, на рахункавода — 288, на яслі — 148, за пошту — 120.

У калгасе ўсяго толькі 19 гусей і за абслугоўванне гэтай «фермы» запісана 230 працадзён. Калгаснікі вылічылі, што пры гэткай сістэме аплаты адзін гусь каштуе калгасу 300 руб.!

За кошт калгаса чамусці аплачваўся мопынік на мпыну, які належыць камітэту ўзаемадапамогі. Пры налічэнні такой вялікай колькасці абслугоўваючага персанала праўленне яшчэ насыпала ў горад па калгасных справах калгаснікаў і налічвала ім за гэта працадні.

Жнівень — месяц найбольшай колькасці палявых работ. У гэты месяц лепшыя ўдарнікі калгаса выпрацавалі па 30-35 працадзён. А старшыні калгаса налічана ў жніўні—47 працадзён, рахункаводу — 36, конюху — 54. Такім чынам, абслугоўваючы персанал атрымаў значна больш за лепшых ударнікаў-калгаснікаў.

У выніку замест 8 проц. абслугоўваючы персанал у калгасе «Чырвоны луч» атрымлівае 37 проц. усіх калгасных даходаў.

Калгас «ПОЛЫМЯ». У гаспадарцы 33 двары. Старшыня калгаса ЦІМОХАЎ атрымлівае штомесячна за старшынства 40 працадзён. Апрача таго, яму налічваецца ў месяц да 10 працадзён за розныя «дробныя работы». Зёзь з поля 3 вазы снапоў — працадзень, павезці у горад — працадзень. Што-б старшыня ні зрабіў, — яму налічваюцца працадні.

Рахункавод ШЫНКЕВІЧ атрымлівае за рахункаводства 1 працадзень. Едзе ў горад — прыпісвае сабе яшчэ 1,75 працадня.

Калі праверылі, якім чынам конюх Палітай «зарабіў» 385 працадзён, аказалася, што ён узяў сабе ў дапамогу хлопчыка — сына выпанага кулака, які за яго працуе ў стайні, а сам ён на полі працуе. У выніку — коні недагледжаны, не накормлены, вупраж не падагнана.

Лепшы ўдарнік РАМАНЕНКА ЯНКА зарабіў да 1 верасня 243 працадні, з гультай і эксплаататар Палітай — 385. Вось вынік няправільнага падыхода да налічэння і выдаткавання працадзён.

У калгасе «АГАНЁК» усяго толькі 30 гаспадарак, а абслугоўваючага персанала — чалавек 10. Тут і старшыня, і брыгадзір, і кладаўшчык, і рахункавод, ёсць нават і спецыяльны касір. На 20 дзяцей ёсць і загадчык яслямі і загадчык дзіцячай пляцоўкай.

Калгаснику Архіпенку Амальяну за 2 гадзіны работы па выбарцы мёда з вуллеяў налічана 3,75 працадня. За дзень работы па пасадцы двух раёў пчол яму запісана 20 працадзён.

У калгасе «ПРАЖЭКТАР» — 19 гаспадарак. І ўсё-ж выявілены ад работы — старшыня, брыгадзір, рахункавод, якія штомесячна атрымліваюць да 40 працадзён кожны. Апрача таго, налічана рахункаводу 21 працадзень, а старшыні — 9 працадзён за паездкі ў горад.

У калгасе імя Калініна адміністрацыйныя выдаткі дасягаюць 20 прац. Такое-ж становішча ў калгасах «Чырвоны партызан», імя Чырвонай арміі, імя Будзённага, «Праўда», «Комсамол», «Першае мая», «Чырвоны Крым». Усяго ў гэтых калгасах разбазарана і няправільна налічана звыш 10 тыс. працадзён, якія ўсім сваім цяжарам знімаюць вагу працадня лепшых калгаснікаў-ударнікаў.

Чым, як не разбазараннем грамадскай уласнасці трэба вытлумачыць той факт, што на ўтрыманні калгаса імя Варашылава знаходзіцца сакратар Кісцяноўскага сельсавета і прыёмшчык малака — работнік Маслапрама? Такіх фактаў можна прывесці шмат.

Рагачоўская РКК-РСІ і палітаддзел МТС зрабілі толькі першую частку работы — яны выявілі няправільна налічаныя працадні.

Зараз трэба правесці другую і найбольш адказную частку работы — масава-растлумачальнай работай у калгасах дабіцца таго, каб вярнуць калгасам расхрадзеныя працадні, каб падзяліць калгасныя даходы па сапраўды выпрацаванай колькасці працадзён.

Направільна налічаныя працадні — неадкладна вярнуць у агульную калгасную касу.

Л. КАПЛАН.

ГУЛЬТАІ НАЖЫВАЮЦЦА ЗА КОШТ УДАРНІКАЎ

Калі падзяліць колькасць працадзён, выпрацаваных у калгасе «1 мая» (Бабруйшчына), на пасеўную плошчу гэтага калгаса, то атрымліваецца, што кожны гектар пасоўваў 80 працадзён. У суседнім Думанаўскім калгасе, які мае такія-ж умовы, як і калгас «1 мая», адзін гектар бяры 50 працадзён. Адно гэта пераўнанне паказвае, што ў «1 мая» злачынна разбазараюцца працадні.

З нізкаякасных прыкладаў відаочна, што разбазарванне працадзён носіць яўна арганізаваны характар і прыводзіць да таго, што кучка гультаёў на чале з праўленнем калгаса крадзе ўрэшце у калгасных калгаснікаў-ударнікаў.

Не глядзіце на тое, што ў калгасе з вясны было ўсяго 16 гаспадарак, старшыня калгаса Гладкевіч, наперакор пастанове Наркамзема, налічваў сабе, нічога не робячы, па 1,5 працадня. Такім чынам, ён нагнаў са бе лішніх 50 працадзён. Мала таго, Гладкевіч рашыў яшчэ больш фарсаваць незаконнае накапленне працадзён. Ён зрабіў прагул—па працягу 8-мі дзён дзесці гуляў. Але для таго, каб за гэтыя дні атрымаць працадні, ён уалаў у фельчара даведку аб «хваробе» і налічыў сабе за гэта 12 працадзён. Апрача гэтага, такі-ж «бюлетэнь» ён прыдбаў і для сваёй жонкі Ульяны і таксама налічыў 14 працадзён.

Усё гэта рабілася тайком. Ведаў аб гэтым толькі рахункавод калгаса Шыцько, які па прыкладу Гладкевіча ўхітрыўся прыпісаць сабе 100 лішніх працадзён.

Іваніцкі Трафім штодзённа атрымліваў як клапоўшчык 0,2 працадня, як загадчык гаспадаркі—0,5 працадня і як касір—0,1 працадня. За месяц—22 працадні. Апрача гэтага Іваніцкі працуе фізічна, за што ў верасні атрымаў 36 працадзён, а разам—58 працадзён. Пасля гэтага зусім не дзіва, што Іваніцкі адзін «выпрацаваў» каля 400 працадзён.

Ударнік Галісеяў, які працаваў на палявых работах, колькі ні стараўся, больш 33 працадзён у месяц не зарабіў. А калгаснік Шыпатоўскі за тое, што перасядзіць ноч у гумне, кожны месяц атрымлівае 40 працадзён. У рэзультаце Шыпатоўскі выпрацаваў амаль у паўтары разы больш, чым Галісеяў. А ў калгасе тры вартаўнікі і кожны з іх бяры не менш за Шыпатоўскага.

Калі падлічыць, колькі расходавана працадзён на невытворчыя работы, то атрымліваецца лічба ў 2.000 працадзён, што складае 15 проц. да агульнаму ліку працадзён калгаса «1 мая».

Не цяжка зразумець, што падобная кулацкая практыка прыводзіць да грабяжа ўдарніка рэшткамі.

А—ны.

„ВЫБАРЫ" Ў ГЕРМАНІІ

МІЛЬЁНЫ ГАЛАСОЎ АБВЕШЧАНЫ „НЕСАПРАЎДНЫМІ"

ВЫБАРЧЫ ФАРС

БЕРЛІН, 13. (БЕЛТА). Увесь друк захлынаецца ад захаплення па поваду вынікаў «выбараў» у рэйхстаг і «плебісцыта».

Ва ўнутрышпалітычных адносінах гэтыя «выбары» і «плебісцыт», паводле слоў фашысцкіх газет, паказалі што «ўвесь германскі народ за ўрад Гітлера і далучыўся да нацыянал-соцыялістаў», а ў адносінах знешняй палітыкі яны прадэманстравалі «згуртаванасць народа ў барацьбе за роўнапраўе Германіі».

«Тэзыя выбары,—піша «Монтаг», —адкрылі шлях да перамагання Версаля».

Характэрна, аднак, што фашысцкі друк поўнасцю замоўчвае, што на выбарах у рэйхстаг было падана звыш 3 млн., г. зн. амаль 8 проц. «несапраўдных» галасоў. Калі ўлічыць, што парадак галасавання падрабязна растлумачваўся на кожным афіцыйным слупе, на сценах кожнага дома і ледзь не на кожным дрэве, на якіх віселі вялізарныя плакаты, дык зусім відавочна, што гэтыя «несапраўдныя» галасы з'яўляюцца актыўнай дэманстрацыяй супроць урада, супроць нацыянал-соцыялістаў. Ускосна гэта прызнае і «Фелькішэр беабахтэр».

Асабліва важна адзначыць, што нават урада у перадвыбарчай кампаніі актыўна выступала толькі нелегальная кампартыя. Гэта ўскосна было прызнана ў паведамленнях аб масавых арыштах рэвалюцыйных рабочых за распаўсюджанне перадвыбарчых адозваў кампартыі. Высокі процант «несапраўдных» галасоў у пролетарскіх выбарчых акругах, г. зн. у тых акругах, дзе ўплыў кампартыі раней быў асабліва вялікі, сведчыць, што актыўнасць падпольнай кампартыі не засталася безрэзультатнай.

Вельмі паказальна, што ў той час, як паводле даных афіцыяльнай статыстыкі па ўсёй Германіі падана 3.352.289 «несапраўдных» галасоў (7,8 проц.), у Гамбургу з 871 тыс. галасоў «несапраўднымі» аказалася 140 тыс., г. зн. звыш 16 проц., у Берліне з 1.328 тыс. галасоў «несапраўднымі» былі 191,9 тыс.—каля 15 проц., у Лейпцыгу з 930,8 тыс. галасоў, «несапраўднымі» былі 120,5 тыс.—каля 13 проц., у акрузе Потсдам з 1.344 тыс. галасоў «несапраўдны» 164,8 тыс.—12 проц. Прыблізна такі-ж процант «несапраўдных» галасоў паданы ў прамысловых акругах Паўднёвай і Паўночнай Вестфаліі і г. д.

Характэрна, што нават у такой тыпова аграрнай правінцыі, як Мекленбург, з 608 тыс. галасоў «несапраўднымі» аказаліся амаль 63 тысячы, г. зн. звыш 10 проц.

Гэта можна растлумачыць толькі тым, што ў Мекленбургу нацыянал-соцыялісты знаходзяцца на чале ўлады значна больш, чым ва ўсёй краіне, і там у насельніцтва накапіўся вопыт.

Гэтым-жа тлумачыцца высокі процант «несапраўдных» галасоў у Турынгіі—каля 8 проц. у той час, як амаль ва ўсіх аграрных акругах лік «несапраўдных» галасоў хістаецца паміж 3 і 5 проц.

Яшчэ больш характэрнымі чым падача «несапраўдных» галасоў, з'яўляюцца тыя дзе з лічбамі мільёны выбаршчыкаў, якія пры ўчарайшным «плебісцыце» аказалі на пастаўленае ўрадам пытанне ці ўхваляюць яны замежную палітыку рашучым «не».

І пры гэтым плебісцыце колькасць выбаршчыкаў, сказаўшых «не», была ў асноўных прамысловых акругах значна вышэй сярэдняга, у той час, як па ўсёй Германіі супроць урадавай палітыкі ў часе плебісцыта выказаліся, згодна афіцыяльнай статыстыкі, 4,7 проц. выбаршчыкаў, у Гамбургу галасавалі «не» 13 проц., у Берліне—каля 11 проц., у Лейпцыгу каля 10 проц. і г. д.

Аб характары пэўнай часткі пібыта паданых за нацыянал-соцыялістаў галасоў можна меркаваць па паведамленню Вольф, што «за ўрад галасавала большасць палітзняволеных у канцэнтрацыйных лагерах».

У паведамленні гаворыцца, што ў канцэнтрацыйным лагеры Брандэнбург з 137, меўшых права голаса, за нацыянал - соцыялістаў галасавала 106, «несапраўдны» былі 31.

Супроць замежнай палітыкі ўрада выказалася ўсяго пібыта 12 чалавек. У лагеры Ораніенбург з 377 галасоў за нацыянал-соцыялістаў гала савала 30 проц. У лагеры Остгафэн каля Франкфурта на Майне за ўрадавую замежную палітыку пібыта гала савала з 88 чалавек 79.

АФІЦЫЯЛЬНЫЯ ВЫНІКІ „ВЫБАРАЎ"

БЕРЛІН, 13. (БЕЛТА).

Згодна паведамлення Вольф папярэдняя вынікі «выбараў» у рэйхстаг і «плебісцыта» наступныя:

На выбарах у рэйхстаг падана 43.007.577 галасоў, г. зн. 98,2%.

З іх нацыянал-соцыялістскі спіс атрымаў 39.655.288 галасоў, г. зн. 92,2 проц. «Несапраўдных» галасоў было падана 3.352.289, г. зн. 7,8 проц.

Пры плебісцыце падана 43.464.420 галасоў, г. зн. 99,9 проц. З іх 40.618.143, г. зн. 93,4 проц. галасавала «так», 2.055.365—4,7 проц. галасавала «не», а 790.910.—1,9 проц. было «несапраўдных» галасоў.

АНТЫВАЕННЫ МІТЫНГ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 12 лістапада.

Адбыўся мітынг, скліканы кампартыяй па поваду гадавіны заключэння перамір'я з Германіяй у 1918 годзе.

Мітынг праводзіўся пад лозунгамі барацьбы ў абарону СССР, барацьбы супроць фашызма, за выратаванне Торглера, Дзімітрава, Таліева і Пепова.

Прысутнічалі 30 тыс. чалавек. У ліку іншых з прамовамі выступілі: балгарскі адвакат Дзечаў, пазбаўлены выключаны з соцыялістычнай партыі за ўдзел у Амстэрдамскім антываенным кангрэсе — Пуці і Вайян Кутюр'е.

(БЕЛТА).

СОВЕЦКА-АМЕРЫКАНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ

ГУТАРКА М. М. ЛІТВІНАВА З РУЗВЕЛЬТАМ

ВАШЫНГТОН, 13 лістапада.

Літвінаў учора прыбыў у «Белы дом» для гутаркі з Рузвельтам у 21 гадзіну (па амерыканскаму часу). Гутарка цягнулася 2 гадзіны. Паводле слоў супрацоўніка Літвінава Вуллітта (спецыяльны памочнік у дзяржаўным дэпартаменце), перагаворы, «як звычайна, раз вяваюцца пасяхова і па-ранейшаму праходзяць нармальна». (БЕЛТА).

БАНКЕТ У ГОНАР М. М. ЛІТВІНАВА

ВАШЫНГТОН, 12. (БЕЛТА).

Моргентау—кіраўнік сельска-гаспадарчага процытнага бюро ПАЗШ—наладзіў банкет у гонар Літвінава. На банкеце былі прысутны Літвінаў і суправаджаўшыя яго асобы.

ГУТАРКА У МІНІСТЭРСТВЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

Н'Ю-ІОРК, 11 лістапада.

З Вашынгтона паведамляюць, што т. Літвінаў наведаў міністэрства замежных спраў, дзе меў гутарку з намеснікам міністра Філіпсам і іншымі кіраўнікамі міністэрства. Гутарка цягнулася 45 мінут. Паводле заявы Філіпса перагаворы развіваюцца пасяхова.

(БЕЛТА)

ПРОШУКІ АНТЫСОВЕЦКІХ КОЛАЎ

ВАШЫНГТОН, 13 лістапада.

Сёння адкрылася адкрытая антацыя супроць прызнання СССР, якая спынілася была з прыбыццём т. Літвінава ў ПАЗШ.

Змешчаны ў «Геральд трыбюн» артыкул Кестля (памочнік міністра замежных спраў пры Гуверу) зноў адстойвае пазіцыі Юза. Рэспубліканскі сенатар Гартфільд (ад штата Заходняя Вірынія) выказваецца ў друку супроць прызнання, спасылаючыся на тое, што СССР імкнецца да звяжэння сацыялістскага ўрада і знішчэння рэлігіі. Кандидат Амерыканскага легіона Фейс таксама зноў выступіў супроць прызнання ў прамове, сказанай у Клівленде.

(БЕЛТА).

Амерыканскі друк аб ходзе перагаворaў

Н'Ю-ІОРК, 12 лістапада.

У сувязі з перагаворамі Літвінава з Рузвельтам «Н'ю-Іорк таймс» паведамляе, што заяўленне перагаворaў тлумачыцца рашэннем амерыканскага ўрада «патрабаваць ад совецкага ўрада істотных запэўненняў па больш буйных спрэчных пытаннях яшчэ да прызнання».

«Думаюць, — піша газета, — што гэта не з'явіцца сур'ёзнай перашкодай на шляху да прызнання, але гэта тлумачыць, чаму перагаворы цягнуцца больш, чым гэта ў вогуле чакалася. Паведамляюць, што гэты ход здзівіў Літвінава, які ў сваім інтэрв'ю ў Берліне заявіў, што паўгадзіны будзе даволі для таго, каб закончыць справы ў Амерыцы. Амерыканскія і рускія адказныя асобы не апублікавалі ні адзінае слова, за выключэннем сумесных камунікэ. Аднак, Літвінаў, як указваюць, думаў, што спрэчныя пытанні будуць абмеркаваны пасля прызнання. Неафіцыяльна паведамляюць, што Літвінаў направільна зразумеў ініцыятыву Рузвельта. Тым не менш у афіцыяльных колах чакаюць, што рэзультатам перагаворaў будзе прызнанне».

Карэспандэнты іншых газет выказваюцца ў тым-жа духу. Карэспандэнт газеты «Н'ю-Іорк гэралд трыбюн» паведамляе:

«Ёсць указанні на тое, што Рузвельт настойвае на дэтальнай дагаворанасці па ўсіх асноўных пытаннях яшчэ да аднаўлення дыпламатычных адносін. Думаюць, што совецкі ўрад згадзіўся з гэтым тэзісам».

Карэспандэнт «Балтымор сан» паведамляе:

«Перагаворы напіраны за межы шчасцяў, якія непасрэдна адносяцца да прызнання, і ахапілі ўсе пытанні, уключаючы і пытанні даўгоў, крэдытаў, прыватных прэтэнзій і контрпрэтэнзій. Пашырэнне абёму перагаворaў выклікала адтэрмінаванне публічнага аб'яўлення аб прызнанні. Як паведамляю

Разбіць сямейнасць і кругавую паруку

(На чыстцы ячэйкі апарата ЦСПСБ)

Персанальная чыстка комуністаў ЦП саюза працасветы дапаўняе малюнак тых глыбокіх палітычных прарываў у рабоце, той бескадказнасці, сямейнасці і падхалімства, якія маюць месца ў гэтым апараце.

Правяраецца т. **Парашчанка.**

Парашчанка—член прэзідыума ЦП і старшыня секцыі пролетстуда. А некалькі гадзін да прыхода на чыстку ён лічыўся ашчэ і парторгам. Лічыўся, але не апраўдаў сябе на гэтай рабоце, як неапраўдаў сябе і на іншых участках. За некалькі гадзін да пачатка персанальнай чысткі Парашчанка пастановай бюро ячэйкі ЦСПСБ знят з работы парторга. Аб гэтым факце, між іншым, Парашчанка дыпламатычна змоўчыў. «Дыпламатыя» гэта аказалася гнілой, нявартай большэвіка спробай замазваць вострыя пытанні.

— Чаму нічога не сказалі аб знятці вас з работы парторга?—цікавіцца камісія.

— Ды проста забыўся,—адказвае Парашчанка.

Вось ужо сапраўды шахабная хлусня, пераходзячая ўсякія межы. Хіба можна паверыць, што для комуніста такія моманты, як знятце з партыйнай работы—і не год, не два і не пяць таму назад, а толькі некалькі гадзін да чысткі — могуць так бясследна знікаць з памяці. Знялі-ж Парашчанка не таму, што ён хацеў працаваць ды не справіўся, а **знялі за культываванне ім сямейнасці і падхалімства ў ЦП, за гніла-ліберальныя адносіны да сабатажа пастановы ЦК КП(б)Б аб рабоце ЦП працасветы.**

Кіраўніцтва ЦП літаральна нічога не зрабіла для ліквідацыі тых прарываў, на якія было ўказана ў спецыяльнай пастанове ЦК КП(б)Б аб рабоце ЦП саюза працасветы. Асветнікі даведаліся аб гэтай пастанове толькі праз газету «ЗКП».

ЦП пачаў «выпраўленне» сваіх памылак з таго, што даручыў двум адказным работнікам Пракаповіч і Родавай выпрацаваць праект пастановы прэзідыума ЦП на аснове рашэння ЦК КП(б)Б. Прахоздзіць некалькі дзён Пракаповіч і Родава адхіляюцца ад даручаных абавязкаў і складанне праекта пастановы даручаецца сакратару ЦП Іванову. Іванова напісала. Старшыня ЦП Нікалаеў не падабаецца. Ён даручае зладзіць вострыя вугалы інструктару Клычкову. На гэтым уся работа і скончылася. Пастанова ЦК КП(б)Б нават не прапрацавана сярод работнікаў апарата ЦП.

Ні малейшага імкнення не праяўле на для разгортвання ў апараце самакрытыкі, як большэвіцкай зброі для выкарчоўвання бюракратычных метадаў кіраўніцтва, дэкларацыйнасці, сямейнасці і чынашанавання. Усё гэта па-ранейшаму моцна трымаецца ў апараце ЦП саюза працасветы.

Не гледзячы на такое становішча, Нікалаеў рознымі махінацыямі настойліва дабіваецца, каб яго кроміявалі перад з'ездам Кастрычніцкай рэволюцыі. Для гэтай мэты апрацоўваецца грамадская думка. У пасценнай газеце з'яўляецца яго партрэт і хвалебны артыкул. У артыкуле між іншым, напісана:

«Улічваючы аддаванасць у рабоце і правядзенне яе большэвіцкімі тэмпамі на аснове спаборніцтва і ўдарніцтва, мясцком пры ЦП саюза ў дзень Кастрычніцкіх свят пастанавіў адзначыць т. Нікалаева як лепшага ўдарніка і выдаць яму білет і грамату ўдарніка».

Якую-ж лінію займаў парторг Парашчанка пры правядзенні гэтай махінацыі? Лінію бясперыпцыннага чыноўніка, жадаючага ва ўсім і заўсёды ў імя свайго асабістага дабра дагаджаць начальству. Для знешняга выгляда Парашчанка заікнуўся штосці наконт таго, што кроміванне немэтазгодна пры наяўнасці прарываў у рабоце. Але варта было Нікалаеву толькі цыкнуць: «ты трус»—і Парашчанка адразу на дыбачках пасунуўся назад. І цяпер на чысткі ён наўпрачкі: «Фармальна я санкцыі на гэта не даваў, а атрымалася...».

Атрымалася падхалімскае ўсхвален не праз пасценгазету Нікалаева і нелегальна спечаная пастанова аб яго кроміванні.

Да якой мэты былі некіраваны гэтыя махінацыі не мог не ведаць Парашчанка. Не мог ён не разумець таго, што ўсё гэта зроблена было з мэтай паказаць неіснуючы аўтарытэт спартыніста Нікалаева напярэдадні яго чысткі.

Парашчанка як парторг ніякага ўплыву не меў на работу комуністаў у апараце ЦП. Аб тым, што ён быў парторгам, многія даведаліся толькі на чысткі. З ЦП саюза працасветы толькі 2 чал (Парашчанка і Дорыны) знаходзяцца ў сваёй ячэйцы ЦСПСБ, а ўсе астатнія прымацаваны да ячэйкі працасветы. Калі Парашчанка часам і імкнуўся ціць тую ці іншую нагрузку комуністам на рабоце ў апараце, дык яму адказвалі: ты парторг толькі над Дорыным, а ў нас свая ячэйка, і атрымлівалася так, што ні хто з комуністаў не адказваў за работу ў апараце ЦП. Справа дакаціла да таго, як гэта выяўлена на чысткі, што **насядзяючы французы ЦП саюза працасветы часам кіраваў беспартыйны работнік Сыс.**

ЦП працасветы аказаўся зусім адарваным ад настаўніцтва і студэнцтва. Пры камплектаванні педінстытутаў і тэхнікумаў дапушчана засмечанасць класава-варожымі элементамі. У магілеўскім педінстытуце, віцебскім, бабруйскім і барысаўскім педтэхнікумах мелі месца вылазкі дэмакразыражаўных шавіністаў, беларускіх нацдэмаў і антысеміцкіх элементаў. Усё гэта праходзіла міма ўвагі ЦП і кіраўніка секцыі студэнцтва Парашчанка. Ашчэ да сённяшняга дня не выкалана дырэктыва партыі аб умацненні настаўніцкімі кадрамі прымежных раёнаў, далёка не ўсюды ачышчан настаўніцкі склад ад класава-чужых элементаў. Гэта становішча ніколькі не турбуе кіраўніцтва ЦП саюза працасветы. Старшыня ЦП Нікалаеў выкарыстоўвае створаную ў апараце абстаноўку сямейнасці і падхалімства для самарэкламы, для культывавання задушнага ў яго асобе «правадырства».

Бюро ячэйкі ЦСПСБ, абмяркаваўшы гэта пытанне, пастанавіла прасіць менскую гарадскую камісію па чысткі падвергнуць чысткі комуністаў работнікаў ЦП саюза працасветы ў ячэйцы ЦСПСБ незалежна ад таго, праходзілі яны чысткі ў ячэйцы асветнікаў ці не.

Я. Ів.

ПАШУМЕЛІ І СУПАКОІЛІСЯ

У часе чысткі парт'ячэйкі менскай шчацінная фабрыкі выяўлена, што вялікая частка членаў і кандыдатаў партыі палітнеісямённая. Аб гэтым праверкасы яроўка запісаў у сваіх вывадах. Аднак, зараз, праз два месяцы пасля чысткі, становішча не змянілася. У ячэйцы 12 чалавек, партыйную школу навучае толькі адзін кандыдат партыі **Трамбіцкі** ды і то нерэгулярна.

Другое, што праверкам запісаў у сваіх вывадах, гэта неабходнасць неадкладна разгарнуць работу на вылучэнню і выхаванню новага актыва. Але ў ячэйцы вывады праверкома не праведзены ў жыццё і не даведзены да кожнага рабочага.

Комсамольская ячэйка, арганізаваная пасля чысткі, нічога не робіць. Культмасавай работы амаль ніякай не праводзіцца. З 50 непісьменных і малапісьменных рабочых і работніц наведваюць гурток чалавек 10. Грамадзкія арганізацыі не працуюць.

На фабрыцы працуюць у сучасны момант 210 чал. з іх 90 чал. моладзі. Вельмі важна прасачыць, як гэтая моладзь выхоўваецца на фабрыцы. У часе абедзенага перапынка ў шкоі фабкома можна чуць мат і інш. пахабшчыну, аўтарам якой з'яўляецца тав. **Жук.** Работніцы **Крывец, Рэвяка і Салавей** у часе абедзенага перапынка паладзілі вынгіўку. Работніца Крывец, калі інструктар **Мішэль** праглядаў работу, схапіла жменю шчацінняга пуха з пылам і сыпанула яму ў вочы. Рабочы Кугель за тое, што яму прапанавалі стаць на іншую працу, «занаравіўся» і зусім кінуў работу. Мінут 20 ён не працаваў. Прыступіў зноў да работы толькі пасля таго, як яго «ўсялі ў абарот».

Работніца **Левановіч** займаецца пад лёжкай вады ў шчаціну для таго, каб атрымаць большую вагу. На ўсе гэтыя агідзнасці фабком, адміністрацыя і парт'ячэйка слаба рэагуюць. Выхаваўчай работы сярод рабочых зусім не вядзецца.

Трэба адзначыць ашчэ і тое, што як у парт'ячэйцы, так і ў рабочым калектыве няма правільнага разумення самакрытыкі, якая ў калектыве не разгорнута. Да нясправных трэба прыняць больш суровыя меры, бо яны з'яўляюцца дэзарганізатарамі вывэрчасці. Партарганізацыя фабрыкі павінна неадкладна перабудаваць работу па ф-цы, бо вышэйказаныя факты гавораць аб тым, што ў часе чысткі пашумелі, а пасля супакоіліся.

Мазо.

МЕНСКАМУ, ВІЦЕБСКАМУ, ГОМЕЛЬСКАМУ ГК, БАРЫСАЎСКАМУ, АРШАНСКАМУ, МАГІЛЕЎСКАМУ, ДЗЯРЖЫНСКАМУ, ЗАСЛАЎСКАМУ РК КП(б)Б, КОПІЯ УСІМ РК КП(б)Б І РК ЛКСМБ

18 лістапада ў 12 гадзін ночы культпроп ЦК КП(б)Б і рэдакцыя газеты **«Звязда» ПРАВОДЗЯЦЬ РАДЫЁ-НАРАДУ** ўсіх спаборничаючых па марксіцка-ленінскай вучобе партарганізацый.

Ваша арганізацыя павінна выступіць з інфармацыяй аб ходзе выканання соцдагавора, заключанага вашай дэлегацыяй на ўсебеларускай культпротнарадзе. З судакладам па інфармацыі выступаюць культпропы РК ЛКСМ і сакратары партбалетыва ў заводах: **у Менску — заводы «Комунар», імя Молатава** і фабрыка **«Кастрычнік»; у Гомелі — завод імя Ланцуцкага, Гомельмаш, «Пролетары»** і фабрыка **«Герой працы»; у Віцебску — фабрыкі «КІМ», «Сцяг індустрыялізацыі» і політаддзел МТС; у Магілеве — шоўкавая фабрыка, гарбарня імя Сталіна; у Оршы—Белдрэс, мясакамбінат, Асінторф; у Барысаве — завод «Комінтэрн», імя Домбаля, Зембінскі сельсавет; Дзяржынск — Негарэлае, саўгас імя Сталіна;** Заслаўе—совецкая і кааперацыйная ячэйкі. **Культпроп ЦК КП(б)Б—Клімаў.**

«Звязда» — БРАГІНСКІ.

УЗНЯЦЬ ЯКАСЦЬ ВУЧОБЫ, ПАЛЕПШЫЦЬ МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВЫЯ УМОВЫ СТУДЭНЦТВА

САРВАЛІ НАБОР, ЗРЫВАЮЦЬ І ВУЧОБУ

Тарфяная прамысловасць у цяперашні час з'яўляецца адной з важнейшых галін нашай народнай гаспадаркі. Зусім праразумела, што і падрыхтоўка кадраў работнікаў торфапрамысловасці павінна быць пастаўлена на належную вышыню. Між тым, у адзіным у БССР тарфяным тэхнікуме з года ў год — ганебнейшыя прарывы.

Тарфяны тэхнікум сёлета існуе як самастойная адзінка; у ім налічваецца па 550 студэнтаў — 10 груп. Адгэтуль—простый разлік, што, каб правесці больш-менш здавальняючы заняткі, тэхнікум павінен мець хоць-бы пяць аўдыторый (на 2 змены). Але сёлета тэхнікум на гэтыя 10 груп студэнтаў мае толькі 2 аўдыторыі і... адзін калідор.

На трэцім курсе налічваецца 51 чалавек. А дырэкцыя, каб не апрымалася прарыва, злучыла ўсіх у адну групу і чыравоздіць запыткі ўрыўкамі, у залі агульнага карыстання політэхнічнага інстытута і торфатэхнікума. У часе лекцый па гэтай залі хоцяць як па праходным двары. Зразумела, што пры такіх абставінах не прыходзіцца і гаварыць пра ступень засвоення студэнтамі ведаў. Памяшканне, якое належыць тарфяному тэхнікуму, займае зараз страхкаса, якая ўжо другі год аслабанне яго, і ніяк не можа аслабаніць.

Пры тэхнікуме зусім няма кабінетаў, у якіх студэнты змаглі-б практычна працаваць над тымі ці іншымі дысцыплінамі. Навучальныя прылады валяюцца на дваро, пад дажджом. Частка іх ляжыць у шафах па калідоры. Характэрна, што не скарыстаны каля 8 тыс. руб., адпушчаных на закупку і належнае абсталяванне механічнага, хімічнага, геадэзычнага і іншых кабінетаў.

Студэнты тэхнікума надзвычай дрэнна забяспечаны. Інтэрнат цесны. Памяшканне, якое было адведзена для студэнтаў, займаюць чамусці людзі, якія не маюць ніякіх адносін да тарфянага тэхнікума. Студэнты-ж спяць па 2-3 чалавекі на адным ложку. У выніку — у лаках нават не змяшчаюцца прослы, няма ні аднаго стала: усё з-за недахвата месца павыкінута ў калідор. Людзей, якія жывуць у памяшканнях тэхнікума (Літвінаў, Карандзей, Мацвяёнак), ушарта не высяляюць.

Трэба сказаць, што і выкладчыкам персаналам па відучых дысцыплінах (напр. эксплаатацыя балот) тэхнікум не забяспечан. Наркамцяжпрам і Белторф прапанавалі дырэктару тэхнікума запрасіць выкладчыка з Масквы, але яму патрэбна было плаціць каля 700 руб. у месяц і тэхнікуму маўскі бюджэт «не вытрымаў». У выніку—выкладчыка па эксплаатацыі балот усё-ж такі няма і студэнты выйдуць з тэхнікума, не ведаючы гэтай галоўнейшай у іх умовах дысцыпліны.

Дырэкцыя тэхнікума не падрыхтавалася да сустрэчы новага навучальнага года. Больш таго, яна імкнулася замазаць гэты факт, указваючы ў сваіх справаздачах, што тэхнікум знаходзіцца ў добрым становішчы (даклад па ЦП саюза). Між тым, новы прыём студэнтаў 1-га курса прайшоў дрэнна. Дырэкцыя не ведае нават, калі яна прыняла, і цяпер толькі просіць залічаных у тэхнікум прадставіць даведкі аб сацыяльным паходжанні іх, прадставіць анкеты, фотакарткі і т. д. Белторф і Наркамцяжпрам, не гледзячы на сігналы тэхнікумаўскіх арганізацый, не звяртаюць ніякай увагі на становішча тэхнікума, не дапамагаюць яму.

Такое становішча падалей недапрымі.

Студэнты: Шахрой, Пінчук, Кучынскі.

Аздаравіць кіраўніцтва тэхнікума

Ягчэ ў мінулым навучальным годзе менскі гарком КП(б)Б вынес пастанову аб становішчы Белпедтэхнікума, у якой было адзначана, што выкладанне асноўных дысцыплін у тэхнікуме знаходзіцца ў руках яўна класава-варожых элементаў і што кіраўніцтву яго неабходна весці рашучую барацьбу за аздараўленне выкладчыцкага склада. Але кіраўніцтва тэхнікума не зрабіла для сябе вываду. Так, выкладчыка Дробышна, як непадзейнага, аслабанілі ад выкладання педагогікі і прызначылі выкладчыкам эканомгеаграфіі, як дысцыпліны, «менш партыйнай»! Гэтага Дробышна пакінулі кіраўніком педпрактыкума і, каб ваяжоніць да працы, стварылі для яго спецыяльную пасаду сакратара навучальнай часткі. Калі-ж убачылі, што гэта пасада ні штатам, ні кашторысам не прадугледжана, дык прызначылі яго загатункам неіснуючага ў тэхнікуме педкабінета.

Выкладчыкі Чайко і Стралецкая атрымалі мачымасць зноў праводзіць сваю варожую дзейнасць. Яны выступілі ініцыятарамі зрыва падпісі на пазыку першага года другой пяцігодкі і не атрымалі належнага адпора ні з боку кіраўніцтва, ні з боку грамадскасці тэхнікума.

Затое дырэктар тэхнікума тав. Якаўлеў завербаваў сабе на сталую працу знятага з свой час а работы ў Чэрыкаўскім раёне выкладчыка Карамазава. Гэты Карамазаў за вельмі кароткі час адолеў выявіць свой палітычны твар хоць бы ў адносінах да новага беларускага правапісу. Ён зусім адкрыта і недвухсэнсоўна заявіў, што новы беларускі правапіс — гэта «той-жа самы правапіс Лёзіка, толькі з незначнымі змянамі...» Карамазаў зусім «забыўся» пра тое, што пастанова СНК БССР пра змены і спрашчэнне беларускага правапіса з'яўляецца важным палітычным актам, рашучым ударам, выгнаніючым з беларускай мовы, з яе правапіса ўсе нацыянал-дэмакратычныя ўплывы і скажэнні.

Палітычна-слянное кіраўніцтва дырэктара Якаўлева і загадчыка навучальнай часткі Чучко пры адсутнасці крытыкі і самакрытыкі, пры безгаспадарчасці і бесцэнтральнасці, выклікала поўны заняпад выхаваўчай работы ў тэхнікуме, і значны адсеў студэнтаў. Укамплектаванне студэнтамі праходзіла сёлета самацёкам і галоўным чынам за лік тых, якія па розных прычынах не былі прыняты ў тыя ці іншыя навучальныя ўстановы Менска. З гэтай прычыны якасны склад новазалічаных аказаўся нездавальняючым перш за ўсё ў адносінах сацыяльнага паходжання. Так, напрыклад, у тэхнікум прынята рабочых і іх дзяцей 14 чалавек, калгаснікаў — 101, сялян-аднаасобнікаў — 44, служачых — 11 і іншых 14 чал., прычым невядома, хто гэта «іншыя». Але і з гэтай колькасці прынятых як у тэхнікум, так і на аднагадовыя педкурсы (269 чал.). 75 чал. кінулі ўжо вучобу. Ніякай барацьбы з адсевам не вядзецца, калі не лічыць штодзённага падпісвання загадаў аб выключэнні студэнтаў, як «дэзертыраў з культфронта».

Арганізацыя педпрацэса і метадычнае кіраўніцтва што называецца «трымаюцца на кастылях». Метадычныя камісіі — не разгарнулі як належыць сваёй работы. Улік паспяховасці студэнтаў асобнымі выкладчыкамі праводзіцца прымітыўна. На адной з выпорчых нарад даводзілася, што індывідуальны ўлік пасяховасці студэнтаў ніякім правядзіцца без удзела ўсёй аўдыторыі. Студэнта, моў, можна выклікаць да стала і пытаць з ім «індывідуальна», а ўся аўдыторыя ў гэты час займаецца самастойнай работай... Устаноўка, вядавочна, шкодная, бо індывідуальная праверка ведаў студэнта зразумела, павінна быць арганізавана так, каб кожнае пытанне выкладчыка і кожны адказ студэнта былі вядомы ўсёй аўдыторыі, каб кожны студэнт сам (зразумела, з дазвола выкладчыка) мог уносіць поўныя папраўкі, дадаткі ў адказы і інш.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб нагрузках студэнтаў зусім забалтана. Студэнты не маюць літаральна ні аднаго вечара, вольнага ад розных пасяджэнняў і сходаў: бывае так, што на адзін вечар выпадае па 2 сходы.

У тэхнікуме не адчуваецца ніякай партыйнай работы. З пачатку навучальнага года адбыўся толькі адзін партыйна-комсамольскі сход. Зусім слаба разгорнута палітвучоба, асабліва сярод работнікаў і студэнтаў у інтэрнатах, хаця даўно ўжо арганізаваны адзіаведныя гурткі і кіраўнікі атрымліваюць зарплату. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва існуюць фармальна, бо дагаворы складаюцца нерэальныя, некашкрэтныя і выкананне іх ніколі не правяраецца.

Дырэктар Якаўлеў і загадчык навучальнай часткі Чучко з «благаслаўлення» сакратара парт'ячэйкі Даўгаполава ўпарта праводзяць курс на выкананне таго, хто дазваляе сабе хоць адным словам выступіць супроць іх.

Калі дадаць да гэтага надзвычай дрэнная гаспадарчая становішча тэхнікума, які на сённяшні дзень ашчэ не забяспечан апалам, адрамантаванай мэбляй, па мяшканнямі (хаця ўсе матэрыяльныя магчымасці ёсць), — дык стане відавочна, што кіраўніцтва тэхнікума знаходзіцца ў ненадзейных руках. Кіраўніцтва Белпедтэхнікума патрабуе рашучага аздараўлення!

ШЫЛА.

Так кельга рыхтаваць спецыялістаў

З пачатку навучальнага года Цудартранс зліў аўтаэксплаатацыйнае аддзяленне менскага аўтадарожнага тэхнікума з гомельскім аўтадарожным тэхнікумам. Гэта зроблена з прычыны таго, што ў Гомелі ёсць буйныя аўтарэмонтныя майстэрні і цэлы рад габінетаў, прыстасаваных для лепшага вывучэння аўтадарожнай справы.

Але па справе атрымалася так, што ў жніву з пераводам у Гомель, якасць вучобы ў тэхнікуме не толькі не палепшылася, а наадварот, значна пагоршылася. Тэхнікум зусім не падрыхтаваўся да новага навучальнага года. Кіраўніцтва яго засмечана і па сённяшні дзень класава-чужымі элементамі. Дырэктар тэхнікума Кухарэнка вычышчае цяпер з партыі як сын эксплаататара, як самы заўзяты зацісальнік самакрытыкі. Тэхнікум на сённяшні дзень не забяспечан выкладчыкамі па спецыяльных дысцыплінах.

З 1-га кастрычніка аж дагэтуль ашчэ няма пастаяннага расклада заняткаў. Замест мінімальных 6 лекцый у дзень, у большасці як на трэцім, так і на чацвертым курсе бываюць толькі па 2-4 лекцыі. Галоўдартранс і дырэкцыя тэхнікума аднесліся да такога важнейшага мерапрыемства як пераход у Гомель, фармальна. Перавёзшы цэлых пяць груз, яны не перавялі пісьмовага выкладчыка. Лепшыя выкладчыкі, як былы загадчык аўтаэксплаатацыі менскага тэхнікума Бжыцкер тав. Ліхапскі і інш., засталіся ў Менску, і зараз працуюць у іншых навучальных установах, не на лініі Галоўдартранса.

Мы лічым, што такая пастаноўка справы — проста шкодніцкая. Галоўдартранс як непасрэдны гаспадар тэхнікума, якасцей у самым хуткім часе аздаравіць кіраўніцтва тэхнікума, забяспечыць яго штат добраякаснымі выкладчыкамі па спецыяльных дысцыплінах.

Група студэнтаў: А. ШАЦКІ, І. ЧУХМАН, С. ГІМЕЛЬШТЭЙН і інш.

Ударніцы дарожнага будаўніцтва далі слова

(НА НАРАДЗЕ ПРЫ РЭДАКЦЫІ ГАЗ. «ЗВЯЗДА»).

Дарога АДПР-4 скончана. Па вол большэвіцку, энергічна лепшых ударнікаў і ўдарніц, апрацутая грэйдэр, новая, гладкая, ляжла на некалькімі дзесяткамі кіламетраў на месцы ранейшых ухабістых, часта непраезных прасёкаў і тропак і звязала паміж сабой самымі закінутыя куткі трох раёнаў.

Будаўніцтва гэтай магістралі, якая мае надзвычай важнае знаменнае і палітычнае значэнне, скончана да XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

Будаўніцтва дарогі праходзіла ударнымі тэмпамі. Сотні ўдарнікаў і ўдарніц паказалі ўзорныя прыклады работы. Частка гэтых лепшых з лепшых ударнікаў-касцяснік і працоўных аднаасобніц у ліку 100 чал. сабраліся на нараду ў «Звязде». Яны за ўдарную работу першымі пасхалі на аўтамабілях на новай дарозе на Кастрычніцкія святы ў пролетарскую сталіцу БССР—Менск.

— Будуючы дарогу па асобных кавалках, на асобных участках, мы не ўяўлялі ўсёй той велічы, усёй грандыёзнасці таго, што мы будуем.

— Ідучы зараз, як на палазе, праз мясціны, дзе раней тапіліся коні, ламаліся калёсы, падрываліся людзі, проста слізу дасіпся, як гета мы не малі раней падумацца да гэтай пабудовы.

Праўда, мы праязджалі добра, па-ранаму. Часамі было ніякавата, разбіва, калі надыйшлі пазлівыя работы.

— Вядзеш зараз і проста не верыш на глядзецца, якую велічэ, якое прыгостэ тожа зрабіць чалавек.

Гэтыя думкі выказаны ўдарніцамі дарожнага будаўніцтва на нарадзе пры газеце «Звязда», дзе яны дзяліліся вопытам сваёй работы на дарожным будаўніцтве, а таксама і тымі ўражаннямі, якія яны атрымалі на фабрыках і заводах Менска.

— З самага пачатка мы ўсвядомілі значэнне добрых дарог і ўдарна працавалі — гаворыць пазнылая ўдарніца тав. **Лезавацька.** Калі мы праехалі на новай дарозе і ўбачылі, што мы збудавалі, дык проста душа ад радасці месца не знаходзіла. Зараз буду аддаваць усе сілы, колькі іх у мяне хопіць, для таго, каб нашы дарогі ўсе былі такія. Я-б вельмі хацела дажыць да таго часу...

— Будаўць дарогу мы пачыналі з усёй шчырасцю і адданасцю. Думалі, што яна будзе будавацца год пяць. Аказваецца, скончылі за год, — гаворыць ударніца **Цыбульская.**

У нашай вёсцы,—гаворыць т. **Каструбін,** былі два злосныя прагульшчыкі **Камінскіч** і **Пявец,** якія, апрача таго, што самі не выходзілі на работу, дык і другіх адтаварвалі. Мы ім далі рашучы адпор. Калі стала пытанне аб вывазцы каменя і гравія, я, як член сельсавета, правяла сходы і мой участак не толькі прыняў даны план, але выкупуў сустрэчны і выканаў яго да тэрміна.

І гэтак кожная ўдарніца. А ці толькі ўдарніца? Новая дарога, звязала безліч калгасаў, вёсак. Велічэ гэтай дарогі захапляе кожнага калгасніка, кожнага працоўнага аднаасобніка. Запытайце любога селяніна, асабліва старыка і ён расказа вам дзесяткі прыкладаў свайго ўласнага жыцця, колькі раз ён паламаў на рашэйнай дарозе калёсы, колькі раз запрэгаў яго коні, колькі раз праклінаў ён дарогу. Сучасная дарога, новая дарога вызваліла яго цалкам ад гэтых клопатаў. Зараз па дарозе пашлі аўтамабілі, трактары.

Трэба сказаць, што на дарожным будаўніцтве спачатку шло не ўсё добра. Не выкананася нормы, не выкарыстоўвалася поўнасцю рабочая і цягавая сіла, не зварачалася належнай увагі на якасць работы. Кіраўніцтва і партарганізацыя будаўніцтва занялася перабудовай работы толькі ў лістпаді. Рабочыя і цягавая сіла былі замацаваны за участкамі. Кожнаму сельсавету, кожнаму калгасу, кожнай вёсцы былі даны ўчасткі работы. Участкі былі разбіты на дзесяцідворкі. Памёж участкамі было разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

У рэзультаце — велізарнейшы эфект. Нормы не толькі сталі выконвацца, але і перавыконвацца. Машыны пачалі запружацца працэм замест 20-25 мінут у 7-10 мінут. На ўчастках адразу атрымаўся велізарнейшы пералом у рабоце. А ўсё гэта разам узятае прывяло да таго, што магістраль скончана і скончана сапраўднымі большэвіцкімі ўдарнымі тэмпамі.

Дарога пабудавана. Зараз калгаснікі-ўдарнікі далі слова з не меншым энтузіязмам, а не меншай зацікаўленасцю даглядаць новую дарогу, рамонтаваць, трымаць яе ў культурным выглядзе.

Р-ч.

С. Я. Вальфсон

НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНЫ КУЛЬТ ЗАГНІВАЮЧАГА КАПІТАЛІЗМА*)

Тав. Сталін, указаўшы ў сваёй гутарцы з амерыканскай рабочай дэлегацыяй на аднічэнне ў нас у краіне нацыянальнага ўціска і нацыянальна га падзіволення, процідаставіў гэта му факту капіталістычны свет: «Там, у капіталістычных дзяржавах, побач з нацыямі першага рада, з нацыямі прывілеяванымі, з нацыямі «дзяржаўнымі», існуюць нацыі другога разрада, нацыі «недзяржаўныя», нацыі пянёўнапраўныя, пазбаўленыя тых або іншых правоў, і перш за ўсё дзяржаўных правоў»...

Імперыялістычныя дзяржавы, самым беспарамонным чынам задушылі права нацыі на самавызначэнне, якім яны, як дэмагагічным лозунгам, шырока карысталіся ў сваёй ваеннай прапагандзе. Не гаворачы ўжо аб праве нацыі на самавызначэнне, нават просты ўлік нацыянальных межаў і нацыянальнай прыналежнасці насельніцтва ігнараваўся пераможанымі імперыялістамі па «вышэйшых мерках» абезапасення сябе ад пераможанага працэўніка і процідзеяння краіне пролетарскай дыктатуры, якая нарадзілася ў агні Кастрычніцкай рэволюцыі.

Такім чынам у Версалі, Сен-Жермене, на Парыжскай канферэнцыі карта Эўропы была перакроена на прынцыпу стварэння шматнацыянальных «ластуцтных» дзяржаў, закліканых служыць мэтам пераможнай імперыялістычнай Антанты.

У рэзультаце быў створан рад шматнацыянальных дзяржаў, у якіх пануючая нацыянальнасць часам нават не ахапляла паловы ўсяго насельніцтва краіны. Калі звярнуцца да адзінай магчымай у гэтых адносінах статыстычнай крыніцы — афіцыяльнай статыстыкі адпаведных дзяржаў, —якая грашыць вялікімі скажэннямі і фальсіфікацыямі ў інтарэсах кіруючай меншасці, — то і тут мы сутыкнемся з дзіўнымі цыфрамі. Так, напрыклад, у Румыніі румыны складаюць 71,9 проц. насельніцтва, астатняя частка прыходзіцца на долю мад'яр, яўрэяў, немцаў, украінцаў, балгар, рускіх і г. д. Пры гэтым характэрна, што ў некаторых абласцях румыны складаюць меншасць насельніцтва (Трансільванія, Букавіна, Бесарабія). У Новай Дабруджы 49,2 проц. насельніцтва складаюць балгары, 43,4 проц. турэкі і татары, а румыны... 2,7 проц. У Югаславіі на пануючую сербскую нацыянальнасць прыходзіцца 39% насельніцтва дзяржавы; харваты складаюць 23,9 проц., славенцы—8,5 проц., астатняе насельніцтва — балгары, немцы, мад'яры, балгары, албанцы. У Чэха-Славакіі на чэхаў прыходзіцца 44,4 проц.; славакі складаюць 15,5 проц.; немцы—24,7 проц., далей ідуць мад'яры, украінцы, яўрэі, палякі.

Вось толькі некаторыя з мачымых прыкладаў. Значэнне прыведзеных лічбаў становіцца асабліва выразным, калі прыняць пад увагу, што амаль ва ўсіх капіталістычных дзяржавах у большай або меншай меры адкрыта ці замаскавана правядзіцца палітыка нацыянальнага прыгнечання, уладарна дыктуемая інтарэсамі пануючых класаў кіруючай нацыянальнасці. Гэта адносіцца нават да такой дзяржавы, як Бельгія, дзе вялікадзяржаўная нацыя ў 46,5 проц. валоснаў ажыццяўляе палітыку прыгнечання ў адносінах да 52 проц. фламандцаў.

Няма ні адной капіталістычнай дзяржавы, якая не практыкавала-бы ў адносінах да нацыянальных меншасцей самога жорсткага прыгнечання. Даволі назваць рэжым, устаноўлены кіруючымі класамі Польшчы ў Заходняй Украіне і Беларусі.

Дзікія оргіі антысеміцкага тэрора ў Германіі, расправы румынскага ўрада з балгарскай, украінскай, яўрэйскай, нямецкай і іншымі нацыянальнасцямі, прыгнечанні, якім падпадаюць славакі ў Чэха-Славакіі, басскі і каталонцы ў Гішпаніі, харваты і албанцы ў Югаславіі і г. д. Я ўжо пе гаварыў аб жорскім нацыянальным прыгнечанні, якое пашло ў падуладных імперыялістам калоніях і паўкалоніях, аб становішчы непраў у Амерыцы, дзе за адно апошняе дзесяцігоддзе лічвалася 7000 «черных» і інш. Усё гэта даволі вядома. Усім вядома і тая нацыяналістычная крыкня, тыя «чісты рычныя стрэлкі», якія вядуць паміж сабой з неаслабнай энергіяй пануючыя класы сучасных капіталістычных дзяржаў: Літвы з Польшчай, Польшчы з Германіяй, Германіі з Даніяй, Чэха-Славакіі з Венгрыяй, Венгрыі з Югаславіяй, Югаславіі з Італіяй і г. д. і г. д.

Усё гэта з'яўляецца ўдзячнай глебай для таго культа «святога нацыянальнага эгаізма», які становіць сабой адзін з істотных кампанентаў ідэалогіі загніваючага капіталізма.

XII пленум ВКП ўказаў, што «ру навашні, выкліканы цяперашнім сусветным эканамічным крызісам, распад гаспадарчых сувязей сусветнага капіталізма і абвастрэнне барацьбы за рынкі збыта спрыяюць разгулу нацыяналізма і шавінізма сярод пануючых нацый».

Культывуючая «надугае нацыянальнае чванства» (Маркс) буржуазія спа дзяецца, што, накіроўваючы на нацыянальную раўніну «социяльныя страсці», яна затармозіць наступленне пролетарскай рэволюцыі. Буржуазія спрабуе атрэўць масы нацыяналістычным ядам, спадзяючыся такім чынам адцягнуць іх ад класавай барацьбы.

20 год таму назад Вл. Ільіч указаў, што «заўпёчны буржуазны нацыяналізм, прытупляючы, апурманьваючы, раз'ядноўваючы рабочых, каб весці іх на паводу ў буржуазіі, — вось асноўны факт сучаснасці». У сучасны момант гэты буржуазны нацыяналізм у капіталістычных дзяржавах стаў ашчэ больш агрэсіўным, стаў ашчэ больш заўпёчным.

У «дэмакратычную» эру свайго пачатку буржуазія прыкрывала ажыццяўляемы ею нацыянальны ўціск дзвюмі шумнымі заявамі аб сваёй прыхільнасці да свабоды нацыянальнага самавызначэння. Практыку нацыянальнага падзіволення яна нярэдка спалучала з дэкларацыямі аб «абароне правоў» нацыянальных меншасцей. Падобнымі дэкларацыямі суправаджаліся нават такія акты самага грубага гвалта над прынцыпам нацыянальнага самавызначэння, як версальскі і сен-жарменскі дагаворы. Найцяжэйшае нацыянальнае прыгнечанне, якое ажыццяўлялі капіталістычныя дзяржавы пасля імперыялістычнай вайны, капіталісты прабавалі затушаваць пры дапамозе Лігі нацый, гэтай «класічнай шырмы імперыялістычных махінацый» (Сталін). З гэтай мэтай быў інсцэнізаван рад дагаворэў аб «абароне» нацыянальных меншасцей, выкананне якіх было аддана пад вышэйшы «кантроль» Лігі нацый. Не прыходзіцца гаварыць аб тым, што дзейнасць жэнэўскага «цэха спатканняў» была накіравана на фактычнае падтрыманне сістэмы дзяржэйнага нацыянальнага ўціску, узаконенага ў Версалі, Сен-Жарменэ, Парыжы. Найўпны спро бы дробна-буржуазных колаў нацыменшасцей апеляваць да Лігі нацый нязменна канчаліся жалкім фарсам прыняцця рэзалюцый, выказваўшых прыгнечаным нацыянальнасцям «маральнае спачуванне» і благаслаўляўшых прыняцвятальнікаў працягваць сваю справу...

Пераноўшая ў абстаўнках абвостраных класавых супярэчнасцей і ўзмацнаючая хвалі пролетарскай рэволюцыі да метадаў адкрытае, фашыстцкай дыктатуры, буржуазія і ў галіне нацыянальнага пытання пачала выхід ваць за борт ліберальна-дэмакратычную бутафорыю.

Фашызм адкрыта абвяшчае вялікадзяржаўніцкі прынцып безагаворачнага падпяволення нацыянальных меншасцей і адмаўляецца займацца гуль нёй у «дэмакратычныя бірулькі» ўсякіх нацыянальных «самавызначэнняў», «аўтаномій», «абароны нацыянальных правоў» і інш.

Прафесар дзяржаўнага права палерм скага ўніверсітэта Гаспаро Амброзіні наступным чынам растлумачвае, ч

УСЕБЕЛАРУСКІ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ т. ГІКАЛО

ПЕРАТВАРЫЦЬ КОЖНЫ СОЦДАГАВОР У САПРАЎДНУЮ БАЯВУЮ ПРАГРАМУ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЛАН

УТРЫМАЦЬ ГОНАР ПЕРАДАВОГА ПРАДПРЫЕМСТВА

Ініцыятар перадкастрычніцкай пераклічкі ўключыўся ў паход імя тав. Гікало

Вяду час, калі ільнапрадзільная фабрыка «Дзвіна» перажывала цяжкія дні. Гэта былі дні, калі па ўсіх паказальніках фабрыка ішла ў глыбокім прарыве. Зараз, калі час гэты застаўся ззаду, зараз, калі фабрыка адолела не толькі выканаць план трэцяга квартала, але і пакрыць сваю запазычанасць мінулага, перамогі яе б'яўляюцца больш агучнаўзнымі, як для кіраўніцтва фабрыкі, так і для ўсяго ударнага калектыва.

Калі «Дзвіна» выступіла з аловаай «да ўсіх рабочых і работніц БССР» і прапанавала перадкастрычніцкую пераклічку, фабрыка была на пераломе. Права ініцыятара было ўзята ёю радам дасягненняў і ініцыятыў таго ганебнага адступання, у якім яна знаходзілася.

Перадкастрычніцкая пераклічка ўзняла і заклікала да ўдарнай большэвіцкай падрыхтоўкі да 16-й тадавіны мнося пралярыяту Беларусі. Да фі ініцыя пераклічкі прышлі тыя, хто здолеў свае абавязацельствы зрабіць сапраўднай баявой праграмай барацьбы за план.

Як-жа сама «Дзвіна» выканала ўзятыя на сябе абавязацельствы, як яна адпусцілася ў перадавых радах барацьбы за план?

Некалькі лічбаў ілюструюць адказ на гэта пытанне.

За трэці квартал 1933 г. па валавой прадукцыі «Дзвіна» план выканала на 101,71 проц. Кастрычнік—рапаючы месяц у перакліцы, дае не горшыя паказальнікі. План па выпрацоўцы ў кілаграмах выканан на 100,27. План па выпуску валавой прадукцыі за гэты-ж час выканан на 100,14 проц.

Вось паказальнікі, з якімі фабрыка прышла да Кастрычніцкіх свят.

Аднак, гэтыя паказальнікі поўнасцю не характарызуюць дзейнасці прадпрыемства. Яны даюць толькі малюнак барацьбы фабрыкі за колькасныя паказальнікі плана. Перадкастрычніцкая пераклічка дала зрух не толькі ў выкананні плана. У барацьбу за гэты план уключыўся амаль увесь калектыў.

Спаборнічаннем было ахоплена 982 рабочых (індывідуальныя дагаворы), 42 брыгады, якія ахопліваюць 1459 рабочых і 45 інжынерна-тэхнічных работнікаў, прышлі актыўны ўдзел у перакліцы.

А вось яшчэ некалькі лічбаў.

За час перакліцы ўнесена 71 прапанова. За гэты-ж час замацавалася за прадпрыемствам да канца другой пяцігодкі 1340 рабочых. Гэта лічба гаворыць аб вялікай рабоце, якая была праведзена партыйнай і прафесіянальнай арганізацыямі для забеспячэння кадраў на прадпрыемстве.

Кожнае дзеў пачатак сур'ёзнай рабоце па авладанню тэхнікай на фабрыцы. Ужо к канцу перадкастрычніцкай пераклічкі тэхнічнай вучобай было ахоплена 720 рабочых.

Але было-б нецярпімым і шкодным для самога прадпрыемства, калі-б пры пагаршэнні выпікаў перадкастрычніцкай пераклічкі, не сказаць і аб радзе буйнейшых недахопаў у рабоце фабрыкі.

Ці можна аднесці заслугай той факт, што да гэтага часу адміністрацыйна-тэхнічны персанал не павярнуўся тварам да нізавога звяна—брыгады і ўчастка, што гаспадарчы разрахунак фактычна існуе толькі на паперы, што ў рабоце прыгарадная гаспадарка ёсць буйнейшым недахопам.

Зразумела, не!

Прычыны такога становішча крыюцца ў рабоце самога кіраўніцтва фабрыкі. Перад намі дакумент, падпісаны трыкутнікам фабрыкі, у якім ён прызнае, што прычыны дрэннага становішча прыгарадной гаспадаркі заключаюцца ў тым, што «трыкутнік фабрыкі за час веснавой пасеўнай кампаніі не прыняў належных мер, не вёў большэвіцкай барацьбы за павышэнне ўраджайнасці».

Гэта прызнанне самога трыкутніка ясна сведчыць аб тым, што фабрыка ведае свае хібы. Таму знайсці шлях да ліквідацыі трыкутніку вельмі лёгка.

Некалькі дзён таму назад делегаты першага ўсебеларускага злёта па якасці вярнуліся ў Віцебск. Яшчэ да прыезда іх сама фабрыка рашыла працягнуць перакліку да 1-га студзеня. І зараз делегаты, падпісаўшы абавязацельства на злёце аб уключэнні ва ўсебеларускі вытворчы паход імя т. Гікало, разгортваюць работу па ўключэнні ў новае спаборніцтва.

Гонар перадавога прадпрыемства заключаецца не толькі ў тым, каб заключаць да барацьбы ва план, але самому ў першую чаргу пачаць справы большэвіцкай барацьбы за паспяховае завяршэнне першага года другой пяцігодкі.

Перадкастрычніцкая пераклічка дакажала, што сумняваецца ў гэтым у нас няма ніякіх падстаў. «Дзвіна» з поспехам дасягнула перамогі і ў абвешчаным вытворчым паходзе імя т. Гікало. Б.

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ ПЛАН

Трохтысячны рабочы калектыў бабруйскага лесакамбіната не раз паказваў узоры сапраўднай барацьбы за справу партыі. План першай пяцігодкі камбінат выканаў поўнасцю.

Але ў першым годзе другой пяцігодкі наш камбінат здаў тэмпы.

Чысткі раёў партарганізацыі лесакамбіната ўскрыла прычыны адставання. Засмечанасць антысавецкімі элементамі, сямейнасць і адарванасць кіраўніцтва камбіната ад вытворчасці, шкодніцкае ігнараванне рабочай ініцыятывы, злачынная безгаспадарчасць — усё гэта з'явілася прычынамі зрыву выканання прамфінплана. Аб гэтым «Звязда» не раз пісала і паўтарацца не варта.

Лепш скажам, што мы робім для таго, каб ліквідаваць прарывы і вывесці лесакамбінат на перадавыя пазіцыі. Па прыкладу маскоўскіх заводаў мы пачалі з ушчыльнення працоўнага дня. «Працеваць усе 420 мінут» — вось лозунг, пад якім праходзіць зараз уся работа на камбінаце.

Хронаметраж паказаў, што рабочы дзень на камбінаце загружан толькі на 80 проц. Пятая частка дня прападала на прастоі і замаскіраваныя прагулы, непатрэбныя адлучкі на медпункт, шуканне інструментаў, а то і проста прагулкі.

Прычынай прастояў з'яўлялася недзейчая дрэнная работа транспарта. Абстаўленне прадпрыемства аказалася ў залежнасці ад прыватніка, які, карыстаючыся гэтым, здзіраў з камбіната вялізныя грошы (3 млн. руб. у год) і зрываў перавозкі.

Зусім ясна, што задаваўленне работы прадпрыемства мы павінны былі пачаць з арганізацыі ўласнага транспарта, які стаў-бы на ўзровень той тэхнікі, якую мае лесакамбінат. Пабудаваны паміж цэхамі вузкакалейкі і пуцілі па іх трактары-цягачы, адрэмантаваны лесавозы. І адразу-ж крывая выканання плана рэзка ўзнялася ў гару. Апрача гэтага камбінат пачаў эканоміць мільён руб. у год.

Праверылі становішча соцспаборніцтва і высветлілі, што 200 чал. з'яўляліся інжэнэрнікамі. Мы здолелі ўзняць новую хвалю соцспаборніцтва і ўдарніцтва, перагледзелі соцдагаворы. Рабочыя ў сувязі з перадкастрычніцкай пераклічкай і падрыхтоўкай да ўсебеларускага злёта ўдарнікаў якасці ўзялі на сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў. Вярбоўшчыкі заканпрактаваралі 500 новых рабочых. Для іх падрыхтаваны цёплыя памяшканні.

Цэлы комплекс мерапрыемстваў даў станоўчыя вынікі. Праграма па экспарту камбінатам зараз выконваецца на 107 проц. Беспрэрўны цэх выканаў свае задаўненні на 101 проц., цэх стандартных дамоў—на 102 проц., лесацэх нумар 1 —на 101 проц.

Асобліва палепшылася работа лесацэха. Гэты цэх раней сістэматычна не выконваў свайго задання, што адбівалася на рабоце іншых цэхаў камбіната. Зараз лесацэх выконвае дзённую праграму на 110-115 проц. Ён стаў добра працеваць таму, што ў выніку арганізаванага набора рабочай сілы яму забяспечана бесперабойная падача леса для распілоўкі. Аздараўленне работы транспарта зноўчыла заваль гатовай прадукцыі, з-за чаго раней часта былі прастоі. Усё гэта дало магчымасць лесацэху ўзняць прадукцыйнасць працы на 113 проц.

Аднак, не гледзячы на гэтыя дасягненні, мы яшчэ не вылезлі з прарыва. Вытворчае задание за 10 месяцаў па камбінату выканана толькі на 98 проц. Прастоі хаця і знізіліся, але займаюць яшчэ значнае месца — 8 проц.

Лесакамбінат зараз на пераломе. Наш абавязак дабіцца поўнага выканання плана 4-га квартала, пакрыць у гэтым квартале запазычанасць, якая засталася ад мінулых кварталаў. Мы ўключыліся ва ўсебеларускі вытворчы паход імя тав. ГІКАЛО. Гэты паход павінен забяспечыць нам поўнае датэрмінове выкананне плана першага года другой пяцігодкі.

Сакратар парткома лесакамбіната КРЫВУЛІН.

г. Бабруйск.

Уключыліся ў паход

*** МЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КАГАНОВІЧА** 10 лістапада ўключылася ў паход. Фабрыка да апошняга часу была ў глыбокім прарыве па якасці прадукцыі. Адхіленне ад гатунковасці дасягала 23 проц. У сувязі з такім цяжкім становішчам на фабрыцы ўключэнне ў паход імя тав. Гікало ўзмацніла хвалю спаборніцтва за лепшую якасць.

*** АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ ДРЭВААПРАЦОЎЧАГА ЗАВОДА ІМЯ МОЛАТАВА** пастанавіў уключыцца ў паход імя т. Гікало. Выпрацоўваюцца па цэхах канкрэтныя абавязацельствы.

*** ЦЭНТРАЛЬНАЕ ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА ГАРБАРОЎ,** рыхтуючыся да паходу імя т. Гікало, звярнула ўвагу абутковых фабрык на неабходнасць перанясення цэнтра ўвагі на якасць. ЦП паставіла перад сабой задачу — выцягнуць з прарыва па якасных паказальніках абутковыя фабрыкі імя т. Кагановіча, «Праца» і імя Лекерта.

*** ДЭЛЕГАТЫ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА** ад металазаводаў і чыгункі заключылі паміж сабой дагавор на спаборніцтва ў паходзе імя т. Гікало. Дагавор прапрацоўваецца ва ўсіх цэхах гомельскага завода «Пролетарый», Гомсельмаша, завода імя Лавацкага, гомельскага паравозного дэпо, завода імя Варашылава, менскага завода «Комунар» і ў паравозным дэпо Менск.

*** У СУВЯЗІ З ПАХОДАМ** у Наркамцяжпраме БССР устаноўлены комсамольскія пасты для хутчэйшага пра соўвання прапаноў, якія высоўваюцца заводамі.

ПАЛІТАДДЗЕЛЫ МТС, АРГАНІЗУЙЦЕ ДАПАМОГУ ТРАНСПАРТУ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМЫ

Прымайце выклік палітаддзела Дрысенскай МТС

Ніжэй мы друкуем ліст палітаддзела Дрысенскай МТС, узяўшай рад самаабавязацельстваў па арганізаванай дапамозе транспарту ў спегабарацьбе.

Пасля ініцыятывы палітаддзелаў МТС Украіны, якія заклікаюць дагаворы з палітаддзеламі чыгунак па канкрэтную дапамогу ў барацьбе з снегавымі заносамі, пачынаюць палітаддзела Дрысенскай МТС з'яўляецца пачаткам паварота шырокай пролетарскай і калгаснай грамадскасці БССР тварам да транспарта. Імення ў гэтым у першую чаргу значэнне ліста. Няма сумнення, што палітаддзел Дрысенскай МТС улічыць станоўчы вопыт палітаддзела Лазоўскай МТС (Украіна), паказаны ў «Праўдзе», і канкрэтызуе справу дапамогі транспарту.

Прыкладу палітаддзела Дрысенскай МТС, карысталічыся пры гэтым шырока паказаным вопытам у «Праўдзе», павінны наследаваць усе палітаддзелы МТС БССР.

Справа дапамогі транспарту—справа ўсёй краіны. «Праўда» ў перадавым артыкуле, перададным нам па радыё, піша з нозаду гэтага наступнае: **«Няма ні адной галіны народнай гаспадаркі, якая не адчувала-б на сваёй уласнай спіне вынікаў нездавальняючай работы транспарта. У да памозе ўсёй краіны адчувае патрэбу транспарт, які з'яўляецца вузкім месцам народнай гаспадаркі. І гэта дапамога павінна быць аказана. КЛОПАТЫ АБ БЕСПЕРАБОЙНАЙ РАБОЦЕ ТРАНСПАРТА З'ЯЎЛЯЮЦЦА КРОЎНАЙ, РОДНАЙ СПРАВАЙ КОЖНАГА ЗАВОДА, КОЖНАЙ ФАБРЫКІ, САЎГА СА І КАЛГАСА».**

Дапамогу транспарту трэба ўзняць на прынцыпова-палітычную вышыню, як вялікае грамадскае мерапрыемства. Палітаддзелы МТС і чыгунак безумоўна ўлічаць недахопы спегабарацьбы мінулага года, калі вярбоўку рабочай сілы праводзілі бюракратычна, дагаворы заключаліся фармальна, а калгаснікі аб іх не ведалі, калі чыгуначныя арганізацыі бесадказна адносіліся да прыёма і абслугоўвання рабочай сілы. Зараз кожны калгас павінен вылучань для спегабарацьбы поўную колькасць людзей і коняй. Брыгады з вылучаных калгаснікаў павінны ўзначальваць брыгадзірамі з лепшых калгаснікаў-ударнікаў. Да кожнай брыгады неабходна прымацоўваць поўны ўчастак шляху. Гэта ліквідуе абязлічку і дасць магчымасць арганізаваць соцялістычнае спаборніцтва ў спегабарацьбе.

Палітаддзелы МТС, перад вамі стаіць пачэсная задача—арганізаваць соцыялістычную дапамогу транспарту ў барацьбе са снегавымі заносамі з тым, каб гэта работа праводзілася сапраўды ўзорна, па-большэвіцку.

Дапаможам наладзіць снегабарацьбу

Наша партыя стварыла магутны орган для перабудовы чыгуначнага транспарта—палітаддзелы. Перад палітаддзеламі чыгунак пастаўлены вы ключна адказныя задачы па ператварэнні чыгуначнага транспарта ва ўзорную галіну народнай гаспадаркі. Уся партыйная, комсамольская і праф саюзная арганізацыі, актывісты і ўсе працоўныя павінны дапамагчы ў ажыццяўленні гэтай задачы.

Зараз палітаддзелы зварачаюць цэнтральную ўвагу на падрыхтоўку транспарта да зімовых перавозак. Вы разная работа чыгункі непарыўна звязана з выкананнем усяго народна-гаспадарчага плана нашай краіны, са снабжэннем пролетарскіх цэнтраў і Чырвонай арміі, свяцасовым завозам у соцыялістычную вёску патрэбнага сельска-гаспадарчага інвентара і мінеральнага ўчнаення.

Мы лічым сваім большэвіцкім абавязкам аказаць чыгуначнаму транспарту практычную дапамогу ў выраўнэнні пастаўленых перад ім трудзейшых і адказнейшых задач.

Сур'ёзным бічом транспарта ў зімовы перыяд з'яўляюцца снегавыя заносы чыгуначных шляхаў. Для дапамогі палітаддзелу чыгункі лепш і хутчэй арганізаваць барацьбу са снегавымі заносамі мы бярэм на сябе пастаўленыя абавязкі:

Кіраўнікам службы пуці па лініі Свольна, Дрыса і Бігосава аказаць практычную дапамогу па заключэнні дагавораў з нашымі калгасамі на прадстаўленне патрэбнай колькасці рабочай сілы для снегабарацьбы.

Дапамагчы набыць патрэбныя матэрыялы для рамонта кватэр для рабочых.

Аказваць канкрэтную дапамогу транспартным ОРС'ам у заключэнні дагавораў з калгасамі на продаж таварнай прадукцыі (бульбы, мяса, тлушчаў, малака) пасля выканання імі дзяржаўных паставак. Для гэтай мэты мы прымацоўваем да ОРС'аў 10 калгасаў.

Бярэм непасрэднае шэфства над партыйнай ячэйкай станцыі Дрыса па аказанні ёй дапамогі ў разгортванні палітычна-масавай работы.

З другога боку, мы лічым мэтазгодным, каб чыгуначныя арганізацыі ў парадку ўзаемнай дапамогі арганізавалі раёнт інвентара і масава-палітычную работу ў панных калгасах шляхам прымацавання да іх асобных арганізацый.

Выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва начальнікаў палітаддзелаў МТС **Борнзвіч, Полацка, Ветрына, Расон, Лёзны, Гарадка і Сіроціна.** Дапаможам чыгуначнаму транспарту і іх палітаддзелам навесці большэвіцкі парадак на транспарце.

Нач. палітаддзела Дрысенскай МТС ПЛАЎНІК.
Нам. нач. палітаддзела МТС МЕШКЕС.
Нам. нач. палітаддзела КАПРАЛАЎ.
Пам. паліт. аддзела па КСМ рабоце ЛЕВІН.
Жанрарганізатар палітаддзела МТС АЎЗІНА.
Рэдактар газеты палітаддзела МТС «Большэвік Ільнаводства» ПАСТУХОВА.

У ТЭРМІН ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК І СНК АБ РАМОНЦЕ ТРАКТАРАЎ

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМОВАГА РАМОНТА ТРАКТАРАЎ І БУДАЎНІЦТВА МТМ ПА СІСТЭМЕ НАРКАМЗЕМА

З пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 6-XI-1933 г.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР лічаць, што своечасовы і добраякасны рамонт трактараў з'яўляецца адным з рашаючых фактараў, забяспечваючых поспех весенняй пасяўнай кампаніі 1934 г. Між тым, трактарацэнтры і Наркамзем БССР несвоечасова прынялі ўсе неабходныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць нармальны і своечасовы рамонт трактараў, не ўстановілі штодзённага аперацыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай да рамонта і кантроля за ходам самога рамонта. У выніку гэтага 2 МТМ не скончаны пабудовай і абсталяваннем працуючых МТМ [illegible] рад недаробак (асабліва па электрыфікацыі), што ў значнай меры [illegible] поўнае разгортванне рамонта трактараў.

Кастрычніцкі план рамонта выканан толькі на 30 проц. Некаторыя МТС дагэтуль яшчэ не заключылі дагавораў з адпаведнымі МТМ. У МТМ адсутнічаюць зваротныя фонды, што затрымлівае своечасовае завяршэнне будаўніцтва, устаноўку, выпуск запчастак і электрычнага абсталявання. Большасць МТМ яшчэ не падрыхтавалі адпаведнага памяшкання для захавання трактараў і іншых с.-г. машын на зімовы перыяд.

Яўна незадавальняюча праходзіць будаўніцтва і абсталяванне попадкай, віцебскай, гомельскай, лепельскай і даманавіцкай МТМ. Прапанаваць пад асабістую адказнасць НКЗ т. Бенека, сакратароў РК і нач. палітаддзелаў у тых раёнах, дзе ёсць МТМ, дырэктараў МТМ і начальнікаў трактарацэнтраў: т. т. ГРЭБЕНЧЫКА (па попадкай, віцебскай і гомельскай МТМ), СЕЛІВАНАВА (лепельская МТМ) і САРОЧКІНА (даманавіцкая МТМ) своечасова будаўніцтва, абсталяванне і забяспечыць пуск гомельскай, лепельскай МТМ да 15-XI г. г., попадкай і даманавіцкай — да 20-XI—г. г.

Побач з гэтым забяспечыць ліквідацыю недаробак у будаўніцтве і абсталяванні існуючых МТМ да 12-XI г. г.

Абавязаць Белкантору Саюзсельснабрамонта, пад асабістую адказнасць тав. БУДНІКА, паўнасцю завезці недагрузы 3-га квартала па запчастках маторнай групы, асабліва для трактараў ФП, да 12-XI г. г. і дабіцца атрымання іх у лік фондаў IV квартала ў копыкаці, забяспечваючай рамонт трактараў у гэтым квартале паводле плана.

Абавязаць т. САПРЫЦКАГА (Белсельгаснаб) пад яго асабістую адказнасць забяспечыць завод неабходных рамонтных матэрыялаў для бесперабойнага хода рамонта трактараў, асабліва баліта, а т. МІГУТА (Стальзбыт) абавязаць забяспечыць завод высокакласнай металасырэвінай для выраба запчастак.

Ускласці на сакратароў РК, старшынь РВК і начпалітаддзелаў нароўні з дырэктарамі МТМ, МТС і соўгасаў поўную адказнасць за своечасовае і добраякаснае правядзенне зімовага рамонта трактараў, і падрыхтоўку іх да весенняй сяўбы 1934 г.

Абавязаць сакратароў ГК і старшынь гарсоветаў Віцебска і Гомеля, сакратароў і старшынь РВК Аршанскага, Клімавіцкага, Горацкага, Полацкага, Мазырскага, Спуцкага, Рагачоўскага, Лепельскага, Гарадоцкага і Даўрыцкага раёнаў устанавіць пастаянны кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем зімовага рамонта ў МТМ і аказаць ім рэальную дапамогу.

Абавязаць сакратароў РК і начпалітаддзелаў МТС кожныя 5 дзён праяяраць ход рамонта трактараў па сеяіх МТМ і МТС, прымаючы канкрэтныя апе рацыйныя захады, забяспечваючыя свае часовае выкананне плана рамонта трактараў.

Прыняць да ведама, што ЦКК-НК РСІ праводзіць спецыяльную праверку работы трактарацэнтраў па рамонту трактарнага парка і завяршэнню будаўніцтва МТМ, а таксама якасць заключаных дагавораў паміж МТМ і МТС, і што ЦКК-РСІ вылучана спецыяльная група ў сваім апараце для сістэматычнага нагляду і праверкі хода выканання пастановы ЦК і СНК аб рамонце трактараў.

Ухваліць пастанову ЦКК-РСІ аб арганізацыі пры МТМ часовых кантрольных камісій.

Даручыць камісіі выканання пры СНК устанавіць са свайго боку сістэматычную праверку выканання як гэтай пастановы, так і ўсіх іншых дырэктыў ЦК і СНК пра рамонт трактараў.

Даручыць арбінстру ЦК падабраць для работы ў МТМ у якасці сакратароў парт'ячэек на ўвесь час кампаніі рамонта трактарнага парка 15 адказных партыйных работнікаў, у першую чаргу за лік буйных прамысловых гарадоў і накіраваць іх у МТМ не пазней 15-XI г. г.

Абавязаць фракцыю ЦСПСБ ухваліць і накіраваць у МТМ не пазней 15-XI групу адказных прафработнікаў у якасці старшынь рабкомаў.

Даручыць ЦК ЛКСМБ вызначыць рад практычных мерапрыемстваў па ўдзелу комсамольскіх арганізацый у рамонце трактараў, у прыватнасці, ужыць захады да ўмацавання комсамольскіх ячэек кіруючымі кадрамі.

Надаючы выключнае значэнне зімовай кампаніі па рамонту трактарнага парка і ў мэтах забяспечэння гэтай кампаніі баявых тэмпаў, лічыць неабходным силікаць у палове лістапада спецыяльную партнараду сакратароў РК тых раёнаў, дзе ёсць МТМ, а таксама начпалітаддзелаў гэтых раёнаў і дырэктараў МТС, сакратароў парт'ячэек МТМ і дырэктараў соўгасаў, начпалітаддзелаў соўгасаў і сакратароў парт'ячэек соўгасаў.

Даручыць арбінстру ўнесці на разгляд ЦК канкрэтныя прапановы аб парадку работ і тэрміне склікання нарады.

Лічыць неабходным прымацаваць да кожнай МТМ па адной аўтамашыне. Даручыць НКЗему выпучыць для гэтай мэты 6 аўтамашын з пасобных МТС, 2 аўтамашыны перадаць МТМ з ліку аўтатранспарта, што знаходзіцца ў распараджэнні Гомеля і Віцебска, і 4 машыны перадаць з аўтатранспарта Галоўдортранса. Перадача гэтых машын МТМ павінна быць зроблена да 10-XI — 33 г.

Прыняць да ведама заяву т. т. БЕНЕКА і РАТНЕКА аб зацвярджэнні рэспубліканскай кваліфікацыйнай камісіі ў складзе т. т. Стрэле (старшыня), Кепер (сектар механізацыі НКЗема) і Кушнарэнка для праверкі кваліфікацыі трактарыстаў МТС. Абавязаць гэту камісію неадкладна прыступіць да вызначэння ўпаўнаважаных з ліку аўтарыхтаных работнікаў, якія ведаюць трактарную справу, для праверкі непасрэдна на месцах кваліфікацыі ўсіх трактарыстаў МТС. Усю гэту праверку закончыць да 10 снежня.

Даручыць т. ІВАНОВУ — Галоўдортранс — выпучыць па лініі Галоўдортранса 15 спецыялістаў на 2 тыдні ў якасці ўпаўнаважаных рэспубліканскай кваліфікацыйнай камісіі.

Надаючы выключнае значэнне пытанням арганізацыі працы ў МТМ на аснове разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва, даручыць фракцыі ЦП саюза МТС і Наркамзему (а па лініі соўгасаў — разам з Упаўнаркамсоўгасаў) распрацаваць канкрэтныя практычныя мерапрыемствы па гэтаму пытанню і шырока прапрацаваць гэтыя мерапрыемствы на агульных сходах рабочых МТМ.

Для ўмацавання работы МТМ на час зімовай кампаніі рамонта трактараў і для непасрэднага нагляду за ходам гэтай кампаніі даручыць арбінстру паслаць ва ўсе МТМ упаўнаважаных ЦК на тэрмін да 2-х месяцаў.

ЦК звяртае асаблівую ўвагу на якасць рамонта і арганізацыю самай строгай прыёмкі трактараў з рамонта з захаваннем усіх правіл і патрабаванняў сапраўды добраякаснага рамонта, устаноўленых Наркамземам Саюза.

БЕСПРЫТУЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

БАБРУЙСК. (Наш. кар.).

Будаўніцтва Цялушскай МТМ пачата ў 1931 годзе. Тэрмін скончання будаўніцтва—1 мая 1933 г. Сапраўдны выкананне работ да ўстаноўленага тэрміна, дырэкцыя МТС вымаліла ў бульбяшага трактарацэнтра адтэрмінёўку. Трактарацэнтр згадзіўся на закончанне майстэрні да верасня 1933 года.

Але прайшоў верасень, праходзіць кастрычнік, лістапад... а справа не рушыцца.

Калі-ж будзе закончана будаўніцтва МТМ?

— Праз месяц,—адказвае прараб Плящінскі.

Але гэта толькі словы, у якіх не ўскуфен пават сам дырэктар МТС **Аўдзеенка.** Ён загадзя непасрэдна трактары ў рагачоўскую МТМ на рамонт, страціўшы надзею на сваю майстэрню. Зноў палящць тысячы рублёў па перавозкі, тэлеграмы-малашкі, бясконцыя камандыроўкі, звязаныя з рамонтам.

На будаўніцтва МТМ адпушчана 109 тыс. руб. Ужо расходавана больш 130 тыс. руб., а работы яшчэ безліч.

Весной над часткай майстэрні не было даха. Няма і зараз. Вясною вецер гуляў па майстэрні, гуляе і зараз, бо дзвярэй усё яшчэ няма. Праўда, дах хутка будзе зроблен. Але і тут без «пуцаў» не абыходзіцца. Аказ ваецца, майстэрня мала мае карысці ад даха, бо ён бесперашкодна прапускае дождж і вада заліває пастаўленае тут абсталяванне.

— Зірніце на гэты цэх, вам здаец ца, што ён скончан,—кажа механік МТС тав. Гоптар.—А вунь дзірка, і як толькі пойдзе дождж—у цэху паводка. Паглядзіце на гэты напільнік, на ім ад макраты папала іржа і хутка зусім пасусе яго.

Адным словам, паводле заявы Плящінскага адна палова МТМ як быццам закончана. Аднак, ні ў адным з «закончаных» цэхаў працаваць нельга.

Дзе-ж прычыны зрыва будаўніцтва і ганебнай якасці работы?

Для таго, каб будаўніцтва ішло пар малымі тэмпам, патрэбна 50 кваліфікаваных будаўнікоў. А сёння працуе 18 чалавек, з якіх палова не ўмеюць трымаць у руках сякеры, і тыя незакуратна з'яўляюцца на работу. Звычайна пасля кожнага выходнага дня на работу не прыходзіць па некалькі чалавек.

У Плящінскага запісана 800 прозвішч былых работнікаў па будаўніцтве МТМ, якія на практыцы мая—кастрычніка пабывалі тут. Звычайна рабочыя па гэтым будаўніцтве больш адной пяцідзённі не затрымліваюцца.

Вось калі сцены ляжаць напалову незакончаныя дзверы. За гэтыя дзверы бралася некалькі цесляроў і не зрабілі іх, бо больш аднаго дня на будаўніцтве ніхто з іх не затрымліваўся, бо дырэкцыя зусім не клапацілася пра матэрыяльна бытавыя ўмовы рабочых.

Зусім зразумела, што ні адзін кваліфікаваны рабочы на такія ўмовы не згадзіцца. На будаўніцтва самацёкам прыходзяць розныя прахадзімцы, якія толькі псуюць матэрыял. Гэтым між іншым тлумачыцца тое, што працякае дах.

Ёсць дырэктыва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб тым, каб кожная МТС забяспечыла сваім машынам высокаякасную зімоўку. У выкананне гэтай дырэктывы Цялушская МТС паставіла. 10 слупоў будучага гаража і кропка. Рабочыя разбеглісі, лесаматэрыяла няма. Адказны за будаўніцтва нам. дырэктара тав. **Рудак** апусціў бесдапаможна рукі. У рэзультаце 125 розных жантоўных машын, як і летась, ідкаваюць раскіданыя па сядзібе МТС, пад дождж і снегам. **П. А.**

ПАЛІТАДДЗЕЛЫ МТС, АРГАНІЗУЙЦЕ ДАПАМОГУ ТРАНСПАРТУ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМЫ

Прымайце выклік палітаддзела Дрысенскай МТС

Ніжэй мы друкуем ліст палітаддзела Дрысенскай МТС, узяўшай рад самаабавязацельстваў па арганізаванай дапамозе транспарту ў спегабарацьбе.

Пасля ініцыятывы палітаддзелаў МТС Украіны, якія заклікаюць дагаворы з палітаддзеламі чыгунак па канкрэтную дапамогу ў барацьбе з снегавымі заносамі, пачынанне палітаддзела Дрысенскай МТС з'яўляецца пачаткам паварота шырокай пролетарскай і калгаснай грамадскасці БССР тварам да транспарта. Імення ў гэтым у першую чаргу значэнне ліста. Няма сумнення, што палітаддзел Дрысенскай МТС улічыць станоўчы вопыт палітаддзела Лазоўскай МТС (Украіна), паказаны ў «Праўдзе», і канкрэтызуе справу дапамогі транспарту.

Прыкладу палітаддзела Дрысенскай МТС, карысталічыся пры гэтым шырока паказаным вопытам у «Праўдзе», павінны наследаваць усе палітаддзелы МТС БССР.

Справа дапамогі транспарту—справа ўсёй краіны. «Праўда» ў перадавым артыкуле, перададным нам па радыё, піша з нозаду гэтага наступнае: **«Няма ні адной галіны народнай гаспадаркі, якая не адчувала-б на сваёй уласнай спіне вынікаў нездавальняючай работы транспарта. У да памозе ўсёй краіны адчувае патрэбу транспарт, які з'яўляецца вузкім месцам народнай гаспадаркі. І гэта дапамога павінна быць аказана. КЛОПАТЫ АБ БЕСПЕРАБОЙНАЙ РАБОЦЕ ТРАНСПАРТА З'ЯЎЛЯЮЦЦА КРОЎНАЙ, РОДНАЙ СПРАВАЙ КОЖНАГА ЗАВОДА, КОЖНАЙ ФАБРЫКІ, САЎГА СА І КАЛГАСА».**

Дапамогу транспарту трэба ўзняць на прынцыпова-палітычную вышыню, як вялікае грамадскае мерапрыемства. Палітаддзелы МТС і чыгунак безумоўна ўлічаць недахопы спегабарацьбы мінулага года, калі вярбоўку рабочай сілы праводзілі бюракратычна, дагаворы заключаліся фармальна, а калгаснікі аб іх не ведалі, калі чыгуначныя арганізацыі бесадказна адносіліся да прыёма і абслугоўвання рабочай сілы. Зараз кожны калгас павінен вылучань для спегабарацьбы поўную колькасць людзей і коняй. Брыгады з вылучаных калгаснікаў павінны ўзначальвацца брыгадзірамі з лепшых калгаснікаў-ударнікаў. Да кожнай брыгады неабходна прымацоўваць поўны ўчастак шляху. Гэта ліквідуе абязлічку і дасць магчымасць арганізаваць соцыялістычнае спаборніцтва ў спегабарацьбе.

Палітаддзелы МТС, перад вамі стаіць пачэсная задача—арганізаваць соцыялістычную дапамогу транспарту ў барацьбе са снегавымі заносамі з тым, каб гэта работа праводзілася сапраўды ўзорна, па-большэвіцку.

Дапаможам наладзіць снегабарацьбу

Наша партыя стварыла магутны орган для перабудовы чыгуначнага транспарта—палітаддзелы. Перад палітаддзеламі чыгунак пастаўлены вы ключна адказныя задачы па ператварэнні чыгуначнага транспарта ва ўзорную галіну народнай гаспадаркі. Уся партыйная, комсамольская і праф саюзная арганізацыі, актывісты і ўсе працоўныя павінны дапамагчы ў ажыццяўленні гэтай задачы.

Зараз палітаддзелы зварачаюць цэнтральную ўвагу на падрыхтоўку транспарта да зімовых перавозак. Вы разная работа чыгункі непарыўна звязана з выкананнем усяго народна-гаспадарчага плана нашай краіны, са снабжэннем пролетарскіх цэнтраў і Чырвонай арміі, свяцасовым завозам у соцыялістычную вёску патрэбнага сельска-гаспадарчага інвентара і мінеральнага ўчнаення.

Мы лічым сваім большэвіцкім абавязкам аказаць чыгуначнаму транспарту практычную дапамогу ў выраўнэнні пастаўленых перад ім трудзейшых і адказнейшых задач.

Сур'ёзным бічом транспарта ў зімовы перыяд з'яўляюцца снегавыя заносы чыгуначных шляхаў. Для дапамогі палітаддзелу чыгункі лепш і хутчэй арганізаваць барацьбу са снегавымі заносамі мы бярэм на сябе пастаўленыя абавязкі:

Кіраўнікам службы пуці па лініі Свольна, Дрыса і Бігосава аказаць практычную дапамогу па заключэнні дагавораў з нашымі калгасамі на прадстаўленне патрэбнай колькасці рабочай сілы для снегабарацьбы.

Дапамагчы набыць патрэбныя матэрыялы для рамонта кватэр для рабочых.

Аказваць канкрэтную дапамогу транспартным ОРС'ам у заключэнні дагавораў з калгасамі на продаж таварнай прадукцыі (бульбы, мяса, тлушчаў, малака) пасля выканання імі дзяржаўных паставак. Для гэтай мэты мы прымацоўваем да ОРС'аў 10 калгасаў.

Бярэм непасрэднае шэфства над партыйнай ячэйкай станцыі Дрыса па аказанні ёй дапамогі ў разгортванні палітычна-масавай работы.

З другога боку, мы лічым мэтазгодным, каб чыгуначныя арганізацыі ў парадку ўзаемнай дапамогі арганізавалі раёнт інвентара і масава-палітычную работу ў панных калгасах шляхам прымацавання да іх асобных арганізацый.

Выклікаем на соцыялістычнае спаборніцтва начальнікаў палітаддзелаў МТС **Борнзвіч, Полацка, Ветрына, Расон, Лёзны, Гарадка і Сіроціна.** Дапаможам чыгуначнаму транспарту і іх палітаддзелам навесці большэвіцкі парадак на транспарце.

Нач. палітаддзела Дрысенскай МТС ПЛАЎНІК.
Нам. нач. палітаддзела МТС МЕШКЕС.
**Нам. нач. палітаддзела КАПРА

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

Папырэмае лондонскім аддзяленнем агенцтва «Юнайтэд прэс» паведамленне з Масквы, а таксама паведамленне агенцтва «Дэмпо Цусін», якое спасылаецца на нейкія «неафіцыяльныя совецкія» крыніцы аб тым, што «3-га лістапада 6 з 9 японскіх самалётаў былі збіты совецкімі часцямі на манчжурскай граніцы» і што «два японскіх ваенных суды пушчаны на дно ў тэрыторыяльных совецкіх водах каля Камчаткі»,—**ЦАЛКАМ ВЫМЫШЛЕНЫ І ЯЎНА ПРАВАКАЦЫЙНЫ.**

„НАЙВЯЛІКШАЯ Ў ГІСТОРЫІ КАМЕДЫЯ"

СУСВЕТНЫ ДРУК АБ ГЕРМАНСКІХ „ВЫБАРАХ"

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 13. (БЕЛТА).

Друк, каментуючы вынікі «выбараў» у рэйхстаг і «плебісцыта», адзначае, што ў «поспеху» нацыянал-соцыялістаў няма нічога непрадбачанага. Удзельнікі галасавання — члены раней існаваўшых партый — павінны былі ўхваліць знешнюю палітыку Гітлера, каб не быць кваліфікаванымі «здрадніка-мі бацькаўшчыны». Прыходзіцца толькі здзіўляцца,—заяўляюць газеты,—што ў краіне, дзе кожны выступаючы супроць урада, рызыкуе жыццём, знайшлося каля 3 млн. чалавек, галасаваўшых супроць урадавай палітыкі.

Побач з гэтым друк выказвае непакой з повазу далейшых перспектыў знешняй палітыкі Германіі.

— Самае грозкае пытанне зараз, — пішуць газеты, — гэта пытанне аб тым, як Гітлер скарыстае рэзультаты выбараў на міжнароднай арэне.

АЎСТРЫЯ

ВЕНА, 13. (БЕЛТА).

Каментуючы «выбары» ў рэйхстаг, афіцыёз «Эстэрэйхішэ палітышэ карэспандэнц» канстатуе, што галасаванне насіла адкрыта прымусовы характар. Буржуазная «Морген» паведамляе, што ў Берліне тысячы штурмавікоў і члены асобных атрадаў наведвалі вуліцы і масамі затрымлівалі праходжых, уводзячы іх да ўпнаў і прымушаючы іх галасаваць. Газета называе «плебісцыт» найвялікшай у гісторыі камедыяй.

Орган хрысціянскай сацыяльнай партыі «Монтагс пост» канстатуе, што «3 млн. людзей, не гледзячы на люты тэрор, галасаваўшых супроць нацыянал-сацыялістаў, выявілі сапраўдны гераізм».

ПОЛЬШЧА

ВАРШАВА, 13. (БЕЛТА).

Друк ацэньвае «выбары» і «плебісцыт» у Германіі, як мізэрную камедыю, інсцэніраваную ва ўмовах дзікага тэрора.

У якасці ілюстрацыі атмасферы, у якой адбываліся выбары, газеты прыводзяць галасаванне за нацыянал-соцыялістскі спіс знаходзеных у канцэнтрацыйных лагерах і пацыентаў у псіхіятрычных больніцах. Газеты ўказваюць на тое, што на аснове ліку галасоў, паданых за нацыянал-соцыялістаў, бескарысна меркаваць аб настроях германскай прамадзкасці.

ФРАНЦУЗСКІ ЖУРНАЛ АБ СССР

ПАРЫЖ, 13 лістапада.

У штотыдневіку «Эроп нувэль» Луі Фішар у артыкуле аб 16-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі канстатуе, што совецкая ўлада за 16 год існавання перафармавала краіну, і прадбачыць, што на працягу бліжэйшых такіх ж перавярэдаў ператворыцца ў эканамічна магутную краіну, з якою можна будзе параўноўваць толькі ПАЗШ.

«Кастрычніцкая рэвалюцыя, — піша Фішар, — не толькі не скончылася, але ўсё адкрывае новыя крыніцы энергіі. Энтузіязма, ідзе наперад з паднятай галавой, упэўненая ў канчатковай перамозе, прыносячы штодзень новыя поспехі.

Комуністы і пімат совецкіх грамадзян усведамляюць, мільёны падсвядома адчуваюць, што ствараецца новы свет, пры якім і жыццё стане лепшым і шчаслівейшым. Адчуваецца палянізгане».

Указваючы на паспяховую ліквідацыю капіталістычных элементаў у СССР, Фішар канстатуе буйнейшыя індустрыяльныя і сельска-гаспадарчыя поспехі СССР. Фішар піша, што калектывізацыя ўдалася і што калгасы і прамысловасць прадстаўляюць «дзве магутныя апоры совецкай эканамічнай сістэмы».

«Справа не толькі ў тым, — падкрэслівае аўтар, — што ўраджай 1933 года быў высокі, а ў тым, што ён быў высокім іменна дзякуючы калгасам, дзякуючы большэвіцкай палітыцы».

(БЕЛТА).

У ХАРКАВЕ ПАБУДОВАН БУЙНЕЙШЫ Ў СВЕЦЕ САМАЛЁТ

«Праўда» публікуе рапарт трыкутніка харкаўскага завода т. т. Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Ордзжонікідзе, Косіору, Постышаву і Чубару аб пабудове прамадзянскага самалёта-гіганта «К-7», які з'яўляецца самым вялікім сухапутным самалётам у свеце і мае рад выдатных пераваг.

«К-7» — першы ў свеце гігант, пабудаваны з сталі, выраб якой асвоіў дніепрапятроўскі завод імя Леніна.

«Мы — першыя, — гаворыцца ў рапарце, — выраблы найтруднейшую задачу асваення высокагатункавай хромамалібдэнавай сталі ў канструкцыі самалёта-гіганта. Гэта перамога — рэзультат вялізарнага палітычнага, вытворчага і культурнага ўздыма, ахапіўшага заводскі калектыў, адначасова з усімі працоўнымі нашай краіны».

АРЫШТ ЗАБОЙЦЫ АЎГАНСКАГА КАРАЛЯ

ЛОНДАН, 11 лістапада.

Аўганскім пасольствам атрымана паведамленне з Кабула, што забойца аўганскага караля Надыр-хана з'яўляецца аўганец Абдул Халік, які прайшоў у палац караля. Забойца арыштаваны і аддан судовым уладам. (БЕЛТА).

ВАЕННЫЯ ПАДРЫХТАВАННІ ЯПОНІІ

ШАНХАЙ, 13 лістапада.

«Чайна-таймс», спасылаючыся на інфармаваныя крыніцы, паведамляе, што японскія марскія ўлады пачалі зрабіць пераманеўранне японскіх ваенна-марскіх сіл ўздоўж кітайскага ўзбярэжжа.

Газета ўказвае, што пасля абвяшчэння Порт-Артура марскай ваенной базай будаўнічыя работы ў Порт-Артуры ідуць поўным ходам. Гарнізон Порт-Артура, паводле слоў газеты, узмоцнен новым авіяносцам «Ноторо», які можа падняць 48 аэраплянаў.

Другая эскадра японскага ваеннага флота перайменавана ў Манчжурскую эскадру і ўзмоцнена адным авіяносцам, 6 эміпчальнікамі і 6 канаперкамі. Караблі гэтай эскадры прымацаваны да портаў Цыньвандао, Танту, Вейхайвей, Чыфу і Цынцдао. Паміма гэтага, сфармавана новая эскадра для аперацый у паўднёва-кітайскіх водах з базай на востраве Формоза. Караблі гэтай эскадры стаяць у Футчоу, Амоу, Сватоу і Кантоне. (БЕЛТА).

ПРАТЭСТ ФРАНЦУЗСКІХ ПРОЛЕТАРЫЯЎ СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА СУДЗІЛІШЧА

ПАРЫЖ, 12 лістапада.

Французскія чыгуначнікі паслалі ў Германскае пасольства рад дэлегацый з пратэстам супроць метадаў вядзення працэса аб падпале рэйхстага і з патрабаваннем вызвалення абвінавачаных рэвалюцыянераў. Аналагічны пратэст адпраўлен старшыні вярхоўнага суда Бюнгеру «Лігай праў чалавека».

У Парыжы мітынг, скліканы камітэтам дапамогі ахвярам германскага фашызма, пастанавіў узмацніць кампанію за выратаванне Торглера, Дзімітрава, Папова і Танева. (БЕЛТА).

ВЫКРЫЦЦІ АНГЛІЙСКАГА ЖУРНАЛІСТА

ЛОНДАН, 13 лістапада.

Арыштаваны ў свой час, а затым высланы з Германіі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» Пентар апісвае ў сваёй газеце сваё прабыванне ў Мюнхенскай турме.

Між іншым ён паведамляе, што пры ім там знаходзіліся ў зняволенні 18 аўстрыйскіх нацыянал-соцыялістскіх штурмавікоў. Яны перайшлі германскую граніцу, каб прыняць удзел у праектаваным паходзе «аўстрыйскага легіёна» супроць Аўстрыі.

Іх у ліку іншых штурмавікоў накіравалі ў нацыянал-соцыялістскі лагер Лехфельд у Баварыі. Але, калі затым праект антыаўстрыйскага пахода адпаў і лагер быў ліквідаваны, аўстрыйскія штурмавікі атрымалі загад адпраўціцца ў Паўночную Германію, каб «змагацца супроць комунізма».

18 гэтых штурмавікоў адмовіліся адпраўціцца туды, заявіўшы, што яны не для гэтага прыбылі ў Германію. Апрача таго яны пратэставалі супроць мізэрнай «зарплаты», якая была ўстаноўлена ў памеры 50 пфенігаў у дзень, і супроць дрэннага харчавання.

Разам з крайнім атрадам яны былі адпраўлены ў Мюнхенскую турму і ў хуткім часе пасля гэтага ў канцэнтрацыйны лагер Дахау. (БЕЛТА).

На бягучым рахунку 1.156.901 рубель

11 лістапада ў фонд пабудовы эскадрыллі паступіла 1.692 руб, у тым ліку з **Крупскага** раёна 409 руб., **Ушацкага**—394 і **Талачынскага** — 575 руб.

13 лістапада паступіла 3.004 руб., у тым ліку з **Талачынскага** раёна — 229 і **Барысаўскага**—1861 руб.

Усяго на бягучым рахунку 1.156.901 рубель.

Уносяць і выклікаюць

* Па выкліку тав. **ШПАКА** ўношу 20 руб. у фонд пабудовы эскадрыльі імя тав. Кагановіча і выклікаю т. т. **Чумакова** і **Мірошчыка** (расонскі РК КП(б)Б); **Туліна** (ДПУ); **Эстэркіна** (пракуратура); **Ганчарэнка** (МТС); **Храноўскага** (райза); **Соскіна** (аршанскі РК КП(б)Б); **Какавалава** (гарадоцкі РК); **Князева** (слуцкі РВК); **Цофіна** (сіроцінскі РВК).

С. ПАРТНОЎ.

* Па выкліку т. **МАЛКІНА** ўношу 10 руб. і выклікаю т. т. **Зайчыка, Спентара, Мацко, Лефа** і **Яшумава** (СНК).

ЮРАШКЕВІЧ.

* Па выкліку тав. **ГУЛЯЕВА** ўношу 10 руб. і выклікаю т. т. **Матусевіча, Герына, Карловіча, Мацко** і **Сулжаўскага** (СНК).- **ФРЫДМАН.**

* Выклік тав. **ЧАРТКОВА** прымаю, Уношу 10 руб. і выклікаю т. т. **Турэцкага** і **Розума** (кіраўніцтва ПШУ НКЮ); **Мілікоўскага** (гарсовет АСО); **Сагаловіча** (праўленне ЗВК) і **Рудзіцэра** (ЦС Асоавіяхіма БССР).

МАРЦЕЛЬ.

Прысядзібныя ўчасткі ці кулацкія хутары?

(АГЛЯД ЛІСТОЎ)

«Праўда» ў артыкуле «Палітычная слепата» кваліфікавала раздуванне прысядзібных участкаў калгаснікаў, як спробу класавага ворага падарваць калгасную вытворчасць, аслабіць гас падарчую моц калгаса. «Звязда» выкрыла рад спроб кулацкага праводзіць унутры калгасаў прышчэпкаўскую палітыку хутарызацыі.

Ці ўлічылі райкомы партыі сігналы «Праўды» і «Звязды»?

Матэрыялы, паступаючыя з месц, сігналізуюць, што не ўсюды яшчэ раённыя партыйныя арганізацыі зрабілі палітычныя вывады з матэрыялаў, змешчаных у «Праўдзе» і «Звяздзе».

Уваравіцкі раён па ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаніях ганебна адстае. Асабліва дрэнна праводзіцца с.-г. кампанія па калгасным сектары. Ліст тав. **КАЗІМІРАВА** паказвае на сапраўдныя прычыны адставання.

«Калгас «РУХАВІК» увесь час не выпаўзіць з прарываў. Засеяна толькі 82 проц. З 300 га зазяблена зусім мізерная колькасць. Не скончана ўборка бульбы. Многія калгаснікі ўхіляюцца ад работы, выходзяць на працу позна, а то і зусім не выходзяць. Кожны працуе на сваёй прысядзібнай зямлі і скарыстоўвае калгасных коней. Сядзібы разраслісь да 2—2½ га, на іх сеюцца збожжавыя і гародніня культуры. Аб гэтым ведае загадчык райза тав. Табала, але ніякіх мер не прымае».

Такіх калгасаў як «Рухавік» ва Ўваравіцкім раёне нямала. Вялікія прысядзібныя ўчасткі маюць калгаснікі Чабатовіцкага, Смычкоўскага, Сталінскага і Глазаўскага сельсоветаў. Райком партыі ведае аб кулацкіх махінацыях у калгасах і не прымае рашучых мер, чым фактычна катурае спробам раздування калгасных сядзіб.

Кулацкая палітыка хутарызацыі калгасных сядзіб мае месца і ў **Брагінскім раёне.** Вось што піша селькор «Аса».

«Восенню 1932 года і вясной 1933 г. па радзе калгасаў раёна нарэзалі калгаснікам прысядзібныя ўчасткі размерам да паўтара га. Асабліва гэта наглядаецца па калгасах Астраглядаўскага і Буртаўскага сельсоветаў. Зямлю нарэзалі з ведама Астраглядаўскай партыйнай ячэйкі, членам якой з'яўляецца сакратар РК т. КОЖАР».

Каб замаскаваць кулацкі манеўр у калгасах «Чырвоная ніва» і імя Варашылава, Астраглядаўскага і Буртаўскага сельсоветаў, апроч сядзібных зямель нарэзалі з калгаснай зямлі адрэзкі да аднаму га. Пры ўліку пасеяў для дачы абавязкальнасці на збожжапастаўкі кожнаму калгаснику было запісана толькі па 0,75 га пасева. Такім чынам, фактычна партыйчэйка ўтаіла сапраўдныя размеры прысядзібных участкаў і ашукала дзяржаву. За гэтыя адрэзкі плоцяць кадатак і здаюць збожжа калгасы.

Нічога дзіўнага няма, што ў калгасе імя Варашылава, адным з буйнейшых у раёне, на полі яшчэ стаяць копы проса, што абмалот праводзіцца з вялікімі стратамі, што не выкапана каля 50 га бульбы.

У «Звяздзе» пісалася ўжо аб вялікіх прысядзібных участках у некаторых калгасах **Крычаўскага** раёна. Раённыя арганізацыі яшчэ не прыступілі да выпраўлення дапушчаных памылак. Аб гэтым гаворыць карэспандэнцыя селькора «Васіля»:

«Старшыня калгаса «Новае Сормава, тав. КУЦЕБА даўно ўжо паведаміў райзу, што 30 калгаснікаў маюць сядзібы, якія дасягаюць 1 га. Загадчык райза Рулькевіч усё яшчэ ўзгадняе гэта пытанне з райкомам партыі і не высылае камісіяніка ў калгас. У раёне не ведаюць сапраўднага становішча з прысядзібнымі ўчасткамі і не цікавяцца гэтым».

Прыведзеныя факты красамоўна гавораць, што рад раённых арганізацый не вядзе барацьбы са спробамі кулацтва ператварыць іх у асноўную гаспадарку. Прысядзібны ўчастак не павінен перавышаць 0,5 га. Гэта дырэктыва павінна пяўхільна выконвацца ўсімі раённымі арганізацыямі.

Т.

УМОВЫ ПРЫЁМА

НА ТРОХМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ЛЕНІНСКАГА ПАРТЫЙНА-ВУЧЭБНАГА ГАРАДКА ЦК КП(б)Б ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ПАРТОРГАЎ І КІРАЎНІКОЎ ПАРТЫЙНА-КОМСАМОЛЬСКІХ ЯДРАЎ КАЛГАСАЎ.

1. Курсы падрыхтоўваюць парторгаў і кіраўнікоў партыйна-комсамольскіх ядраў калгасаў і калгасных брыгад.

2. На курсы прымаюцца члены партыі не менш як з гадовым парстажам, якія зараз працуюць парторгамі, або кіраўнікамі партыйна-комсамольскіх ядраў і калгасных брыгад, а таксама якія намячаюцца для вылучэння на гэту работу з ліку пізавога актыва.

3. Заняткі на курсах пачынаюцца 25 лістапада 1933 г.; да гэтага часу ўсе залічаныя павінны з'явіцца ў ленінскі партыйна-вучэбны гарадок ЦК КП(б)Б (Менск, тар. былой выстаўкі).

Райкомы КП(б)Б і палітаддзелы павінны даслаць у канцылярыю гарадка да 20 лістапада т. г. на камандыруемых т. т. наступныя дакументы:

а) камандыроўкі райкома КП(б)Б або палітаддзела;

б) анкету, засведчаную РК КП(б)Б або палітаддзелам;

в) даведку аб стаже адароўя;

г) даведку аб колькасці утрыманцаў і атрымліваемай пенсіі.

4. За курсантамі і іх сем'ямі захоўваецца пенсія і ўсе астатнія віды матэрыяльнага забеспячэння па месцы іх ранейшай работы.

Калгаснікі забяспечваюцца стыпендыяй у памеры ад 50 да 100 руб.

5. Курсанты на курсах забяспечваюцца харчаваннем, інтэрнатам, пасцельнымі прыладамі і кучэбнымі дапаможнікамі.

6. Устанаўліваецца наступная развёрстка па райкомах КП(б)Б і палітаддзелах МТС:

а) райкомы КП(б)Б, дзе няма палітаддзелаў МТС, камандыруюць на курсы па 5 чал.;

б) усе астатнія райкомы КП(б)Б камандыруюць па 2 чал.;

в) палітаддзелы МТС камандыруюць з ліку лепш працуючых у калгасах зоны МТС парторгаў і кіраўнікоў партыйна-комсамольскіх ядраў па 3 чал.

Заг. аргінстара ЦК КП(б)Б КАРТУКОЎ.

Нач. палітаддзела НКЗ БССР РАТНЕК.

Дырэктар ленінскага пост.-вуч. гарадка ЦК КП(б)Б МАКОЎСКІ

Паведамленні

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 15 лістапада, у 10 г. ран. у г. Менску (ЦКК, Совецкая 55) адбудзецца пасяджэнне рэспубліканскай камісіі па чыстцы па разгляду апеляцый на рашэнні дысцыплінарных і брыгадных камісій наступных т. т.:

Бецераноў П. В., Давідонис П. П., Чукалаў Я. Д., Івешін І. С., Сталбоў В. І., Тэрэнцьеў А. П., Мельнікаў М. М., Колясін В. С., Вазнітаў М. І., Новолін П. Ф., Сухаў А. Н., Антошчэнка І. С., Асайчэнка Я. А., Леонаў Я. К., Кандратцкі В. П., Андрушчэнка А. Д., Васільчэнка В. І., Цяхаміраў І. В., Гольцэр Г. А., Шыбаеў Б. І., Вілжоў М. С., Вераг А. П., Сцепанаў Н. С., Зайцаў А. Т., Фрэнкель І. І., Фельдман М. І., Вторыў В. В., Вераб'ёў Г. Г., Дамаганскі Н. А.,

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

17-га лістапада ў Менску адбудзецца ўсебеларуская нарада па ўдзелу комсамола ў рамонтнай кампаніі трактарнага парка і падрыхтоўцы трактарыстаў, брыгадзіраў, механікаў. На нараду выкліканы па асобных паведамленнях сакратары райкомаў, памаліты, сакратары ячэек МТМ, сакратары ячэек соўгасаў, Наркамсоўгасаў, сакратары ячэек ЛКСМБ заводаў, выробчых запасных частак.

Таварышы прыбываюць у ЦК ЛКСМБ.

Пачатак нарады а 5-й гадзіне вечара.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ГЕРЦОВІЧ.

Пам. нач. палітсектара МТС НКЗБ ЭЦІН.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць тав. **Фраднікна Барыса Саламонавіча,** шартбілет № 0819001, з'явіцца 20-XI—33 г. у ПК ЦКК (Менск, Совецкая, 55).

Просьба да ўсіх парторганізацый,ведаючых аб месцы знаходжання паказанага таварыша, паведаміць аб гэтым ПК ЦКК.

Партканцелярыя.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. т. **Конікава П. З.** і **Казімірава Р. П.** (працаваўшых раней у Віцебску); **Абрамчыка** (былы дырэктар саўгаса «Загаравы», Віцебскага трэста); **Селіванава Антона Андрэева** (працаваўшага раней у Віцебску); **Ягорава Трафіма Нікалаевіча, Конанава Паўлюка** (працаваўшых раней у Віцебску); **Пчэльнікава Івана Петровіча, Хмызнікава Паула Фалотава, Вясёлага Пятра Герасімавіча, Агурцова Васіля Ільіча, Каўшчэўцова Івана Арцёмавіча, Суляржыцкага Івана Антоновіча, Пімянаву Галіну Рыгораўну, Шчэдрова Алеся Нікафарава, Пасталоўскага Рыгора Сцяпанава, Шрэйдэра Генрыха Кандрацьева, Васільева Васіля Сямёнава, Кулачкова Луку Іванавіча, Сапёва Філіпа, Ульянава Васіля Мікітавіча, Галюдава Хведара Цімафеева, Бязіна Ісака Лейбавіча, Казлова Арцёма Фаміча, Кобеца Сяргея Язэпавіча, Шарэнда Уладзіміра Іванавіча, Яцкіева Івана Сцяпанавіча, Мацюцкага Міхаіла Александравіча, Зароўскага Леаніда Іванавіча** (працаваўшых раней у Віцебску); **Ерафеенка В. А.** (працаваўшага раней у Гомелі) паведаміць ПК ЦКК (Менск, Совецкая, 55) адрас або месца работы і жыхарства без высылкі ў Менск.

Просьба да ўсіх партарганізацый, ведаючых аб месцы знаходжання паказаных т. т., паведаміць аб гэтым ПК ЦКК.

***

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 20-21 лістапада г. г. у г. Гомелі будзе працаваць выязная партканцэлярыя ЦКК КП(б)Б па разгляду спраў наступных таварышаў з Гомельскага раёна:

На 20-XI—33 г.

Марэс П. С., Меркулаў В. В., Гарэшенка С. Я., Грабоўскі Я. Б., Кулгаўскі Я. Б., Гуц Я. Н., Малікін Р., Жыжнеўскі М. Д., Гібаленіч М. Е., Сынсу П. І., Шапорка В. А., Воцэін, Лінкін Д., Ліпман Г. А., Абрацюў Г. А., Арэфэва, Вятошкін С. З., Віцэнберскі, Герасеевіч І. К., Комлеў П. І., Каталкін А. С., Канцэвой М. К., Кавалёў М. Г., Кацельскаў Я. М., Кузьміч Я. М., Казлоў С. М., Крэцюў І. Е., Казлоў Д. І., Мортан А. А., Малашонак І. Г., Мярніцаў С. А., Павлякоў М. Л., Розін Д. Р., Сухарукаў А., Сідарцоў Ф. Д., Хаменкоў А. Я., Якаўлеў І. К., Какудзін Н. Я., Гаўрэчкін Н., Панькоў М., Асташенка К. В., Вербліковў А. Г., Шапуцоў М. І., Калейнікаў В. Е., Фрэнкель З. Б., Шылахін К. П., Нейжевіч С. Я., Кагалёў Д. Б., Трэсніцкі М. М., Шэйман А. Б., Бяброў А. Р., Стыскін М. І., Бартноўскі Ч. П., Русак Г. П., Цыліс А. С., Плоткін Б. З., Лапіцкі Р. Я., Эпштэйн, Смаль А. Г., Іонаў А. С., Пінскі Х. Ю., Перабіковіч Г. М., Ванкруцкі С., Гатэлік М. Б., Кісцень, Кончыц С. А., Левін Е. Г., Трафімэнка, Сарокін, Саратчук.

На 21-XI—33 г.

Рубанаў А. Л., Якуцкін, Філімонаў, Семенчукоў І., Лапатаў А. М., Фенін Л. Ф., Паўлоніч І. Д., Пэпінер Н. І., Сліжакоў М., Асташенка К. Л., Сарокін М. А., Катоўнікаў С. В., Палена А. А., Варкоў Я. М.

Усебеларуская радыёперакліч ка

АЛЛО, АЛЛО!

У НОЧ З 16 НА 17 ЛІСТАПАДА А 24 ГАДЗІНЫ «ЗВЯЗДА», БЕЛКААПСАЮЗ І ЦП САЮЗА РК І Д АРГАНІЗУЮЦЬ ПРАЗ МЕНСКУЮ РАДЫЁСТАНЦЫЮ ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ РАДЫЁ-ПЕРАКЛІЧКУ ПА ПЫТАННЮ **ТАВАРАЗВАРОТА.** У ПЕРАКЛІЧЦЫ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ САКРАТАР ЦК ТАВ. **РЫСКІН** І СТАРШЫНЯ СНК ТАВ. **ГАЛАДЗЕД.**

ДА МІКРАФОНА РАЁННЫХ РАДЫЁ-ВУЗЛОЎ ЗАПРАШАЮЦЦА СТАРШЫНІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗАЎ, ДЫРЭКТАРЫ МІЖРАЙБАЗ БКС, СТАРШЫНІ СЕЛЬСПАЖЫТАВАРЫСТВАЎ, СТАРШЫНІ РАЙКОМАЎ САЮЗА РК І Д, РЭДАКТАРЫ РАЙГАЗЕТ.

У РАЁНАХ, ДЗЕ НЯМА РАДЫЁ-ВУЗЛОЎ, АРГАНІЗУЙЦЕ СЛУХАННЕ ПРАЗ РАДЫЁ-ПРЫЁМНІКІ.

«ЗВЯЗДА», БЕЛКААПСАЮЗ, ЦП САЮЗА РК І Д.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

(вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)

14, 15, 16, 17, 18 лістапада

РЭКРУТ

Пастаноўка заслуж. артыста рэспублікі **М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.**

Пачатак у 8 гадз. вечара.

Білеты ў касе тэатра і ў рабоч. касе.

Прымаюцца заяўкі на культпаходы і мэтавыя спектаклі.

Кіно „Пролетарый" каса-ад 4 ч. | Палонніца гарэма (Мінарэт смерці) мастацкі фільм у 7 ч.

„СПАРТАК" Каса—з 4 г. дня. | Замежны фільм **ПАНОПТА** (ЖАНЧЫНА-СЫЩЫК) драма ў 8 частях.

Кіно Інтэрнацыянал | 2-я серыя замежнага фільма Прыгоды падкідыша

ЦП саюза медсанпрацы сумесна з гарздравам гор. Менска скліканае

АГУЛЬНА-ГАРАДСКІ СХОД сярэдняга медперсанала

(зуб. дактароў, акушорак, лекпомаў, медсясцёр).

Сход адбудзецца ў клубе Медсанпрацы **14 лістапада** у 8 гадз. вечара.

Яўка ўсіх абавязкова. Выклікаючыя дырэктары і старшыні мясцкомаў медустаноў.

Полацкі аўта-трактарны тэхнікум

АБВЯШЧАЕ

ДАДАТКОВЫ НАБОР У ТЭХНІКУМ

на першы курс на базе семігодкі і на **падрыхтоўчыя курсы** на базе шасігодкі.

Прыём заяў і іспыты **да 1-га снежня г. г.**

Таксама адкрыт прыём **у школу аўта-трактарных механікаў** з практычным стажам 2-3 гады, і на **курсы трактарыстаў** на базе 4-5 груп, узростам ад 18 год.

Да заяў прыкладаюцца наст. дакументы: Аб адукацыі, узросце, сацыяльным становішчы і паходжанні, аб здароўі, аб сельгаспадатку і засведчаную анкету.

Можна прыяжджаць адразу з усімі дакументамі.

Тэхнікум забяспечвае стыпендыяй: у тэхнікуме на 1 курсе 35—40 р., па школе механікаў—65 р., на курсах трактарыстаў—30 р. Таксама ёсць сталоўка, інтэрнаты, пральня.

Пасцельныя прылады трэба мець свае.

Адрас: гор. Полацак, вул. К. Маркса, 43.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „Чырвоная-Зорка"

Вялікая перамога совецкай кінематаграфіі

Ад 14 лістапада НОВЫ ГУКАВЫ ГІСТАРЫЧНЫ ФІЛЬМ

1767-68 г.

ВЫТВОРЧАСЦЬ УКРАІНФІЛЬМ

Фільм малюе славутае гайдамакаве паўстанне, вядомае ў гісторыі пад назвай „Калюшчына", якое адбылося у 1768 г.

Па ходу фільма жахлівыя катаванні правадыроў паўстання, якія былі пасаджаны на калы

У ПРАГРАМЕ: ГУКАВАЯ САЮЗКІНАХРОНІКА № 28

Зместі: 1) Два жыцця. Параскі Амеліной 2) Рыондас перад пускам 3) Масква—Нара-Нум—Масква 4) Колгас „Пералом" 5) Зліт планерыстаў 6) Гукі на паперы

Штодзённа 4 сеансы. Пачатак у 5-45, 7-30, 9-15, і 10-45

Касе з 1 гадзіны дня. У фойе—буфет.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР

Ад 14 лістапада НОВЫ ДЗІЦЯЧЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ЗАВАДНЫ ЖУК

у 6 частках

У ПРАГРАМЕ **ГУКАВАЯ ХРОНІКА.**

Пачатак сеансаў: 11, 3, 5 і 7 гадз.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

прэзідыума менскага гарадскога совета

13 лістапада 1933 г. *г. Менск*

Аб правядзенні супроцьсапнай кампаніі

У мэтах паспяховага правядзення супроцьсапнай кампаніі, прэзідыум менскага гарсовета на падставе арт. 43, 44-91 ветэрынарнага статута БССР, п. «б» і пастановы СНК і ЦВК БССР ад 17-V—1927 г. **пастанаўляе:**

1. Правесці, пачынаючы з 10-XI—33 г., малейшаму коням усіх узростаў, якія належаць дзяржаўным, прамадзкім, кааператыўным прадпрыемствам, так і прыватным асобам Менскага раёна, за выключэннем войсковых частей.

2. Для правядзення супроцьсапнай кампаніі скласці раённую ветэрынарна-выканаўчую камісію ў складзе трох чалавек т. т. Жарына, Кручкова і Якаўлева, на якую ўскладзі правядзенне працы па сапкамплекту ў адпаведнасці з ветстатутам БССР і складзеным планам, даручыўшы ўсім сельсоветам скласці адпаведныя сельскія ветвыканаўчыя камісіі з устаноўленнем пунктаў агляду коней па сельсоветах.

3. Для альцыцыўлення мерапрыемстваў, прадугледжаных гэтай пастановай, саўгасы, калгасы і прыватныя асобы, у распараджэнні якіх знаходзяцца коні, абавязаны даставіць апошніх з вучотнымі карткамі для ветагляду і малейшага цы ў тэрміны, устаноўленыя планам. Каляндарны план прыкладаецца.

УВАГА: У вызначаны дзень коні павінны быць даставлены на пункт праверкі да 8 гадзін раніцы і будуць знаходзіцца пад наглядам ветдактара ў вызначаных абгонных пунктах да 8 гадзін вечара.

4. Усе коні, прызнаныя малейшчыкамі, падлягаюць неадкладнай ізаляцыі і павінны быць накіраваны ў малейшую гаспадарку, згодна ўказаньняў раённай ветвыканаўчай камісіі.

5. Нагляд за выкананнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на раённую ветэрынарную выканаўчую камісію, ветнагляд, сельсоветы і міліцыю.

6. Віноватыя ў невыкананні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў горадзе — штрафу да 100 руб. або прымусовым работам да 15 дзён, а ў сельскіх мясцовасцях раёна — штрафу да 10 руб. або прымусовым работам на 2 дні.

7. Гэта абавязковая пастанова ўвасабляць у моц з часу яе абвяшчэння.

Старшыня менгарсовета **КАРАНЕЎСКІ.**

Сакратар гарсовета **КАПЕЛЕВІЧ.**

ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ ТЭХНІКІ ЦК ЛКСМБ І ИКЛП

Комсамольская, 25.

15 лістапада, у 7 гадз. вечара ЦДТ і кафедра соцвучоты БІНГ

арганізуюць

МАСАВУЮ ЛЕКЦЫЮ-КАНСУЛЬТАЦЫЮ

прафесара **МАНОВА** на тэму:

„планавание і вучот у працгадзінах і варштатгадзінах".

Запрашаюцца ІТР прадпрыемстваў, рабочыя, студэнцтва і працаўнікі нарканатаў.

ДЫРЭКЦЫЯ ЦДТ.

Менгарфа напамінае, што **тэрмін уплаты падаходнага падатка з прыватных асоб скончыўся 10 лістапада.**

Асобам, якія не ўнеслі ў тэрмін падатка,

прапануецца ліквідаваць запазычанасць.

Да неплацельшчыкаў **будуць прыняты меры прымусовага спагнання з налічэннем пені.**

МЕНГАРФА.

Увага радыёслухачоў і загадчыкаў трансвузламі

Па пастанове СНК СССР ад 7 сакавіка 1933 г. № 337 усе ўстановы, арганізацыі, прадпрыемствы і адзіночныя асобы, маючыя ў сябе прыёмнікі для радыёслухання, апрача ўстановачнай і абаненцкай платы за тэхнічнае абслугоўванне абавязаны ўносіць абаненцкую плату за слуханне радыё-праграм, незалежна ад забеспячэння прыёмных установак крыніцамі харчавання.

РАЗМЕР ПЛАТЫ Ў ГОД.

За індывідуальнае карыстанне:	
За трансляцыйную кропку	12 р.
За дэтэктарны прыёмнік	3 р.
За лампавы прыёмнік на перамен. току	24 р
За лампавы прыёмнік на пастаянным току	18 р.
За лампавы прыёмнік калектыўнага слуханны (школы, клубы, чытальні, інтэрнаты рабочых і т. д.)	36 р.
За лампавы прыёмнік грамадска-публічнага карыстання (клубы, вакзалы, кіно, рэстараны і т. д.)	50 р.
Па трансвузлах:	
За трансляцыйныя вузлы калектыўнага карыстання, магутнасцю да 10 ват (школы, клубы, хаты-чытальні, інтэрнаты рабочых і т. д.)	36 р.
За трансвузлы грамадска-публічнага карыстання, магутнасцю да 10 ват (клубы, кіно, вакзалы, рэстараны і т. д.)	50 р.
За трансвузлы, абслугоўваючыя ўнутраныя патрэбы арганізацый і устаноў, а таксама калектыўнага і публічна-грамадскага карыстання ад 10 да 30 ват	100 р.
За трансвузлы, абслугоўваючыя ўнутраныя патрэбы арганізацый, прадпрыемстваў і устаноў, а таксама калектыўнага і грамадска-публічнага карыстання ад 30 да 200 ват	300 р.
І звыш 200 ват	500 р.

Беларускае кіраўніцтва сувязі і Усебеларускі камітэт па радыёвяшчанню прапануе усім уласнікам прыёмных установак не пазней 20 лістапада запазычанасць па абаненцкай плаце за 1933 г., у працяўным выпадку на ўласнікаў, не ўнесшых абанен